Державна
Національна бібліотека
ім. Короленка, Харків
ХАРЕКОВ 31 15
ПЕР.КОРОЛЕНКО 18
БИБ.КЕ КОРОЛЕНКО
1.12 ПВ

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК і МЕНСКАГА АБКОМА КП(б)Б

№ 232 (6208) | 6 кастрычніка 1938 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

СЕННЯ Ў НУМАРЫ:

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ III ПЛЕНУМЕ ЦК КП(б)Б.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР аб класіфікацыі населеных пунктаў Беларускай ССР.

Паведамленні аб самалёце «Родина».

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

А. Н. Раманаў — Мацаваць сувязь з беспартыйнымі масамі.

І. Е. Васільеў — Расцем за лік лепшых, адданых партыі людзей.

І. Д. Балотнікаў — Цэнтр партыйнай прапаганды.

АРТЫКУЛЫ:

В. Грызадубава — Мара.

А. Глозман — Павялічыць выраб прадметаў шырокага спажывання.

З. Ларысаў — Правільна арганізаваць здачу ільнапрадукцыі.

А. Казей — Не кіруюць сцягваннем хутароў.

Л. Фрумін — Забытыя прадметы выкладання.

Эпізоды гераічных баёў ля возера Хасан: Сустрэча на пазіцыі.

Спаборніцтва на лепшую пастаноўку абаронная работы.

З апошняй пошты: Шкодная паспешнасць.

Кіно: «Ворагі».

ЗА РУБЯЖОМ:

Прэзідэнт Чэхаславакіі Бенеш склаў свае паўнамоцтвы.

Спрэчкі аб знешняй палітыцы Францыі.

Прамова Чэмберлена ў палаце дэпутатаў.

Новы састаў чэхаславацкага ўрада.

Ультыматыўнае патрабаванне славацкіх аўтанамістаў.

Новы англійскі дэмарш ў Празе.

На франтах у Іспаніі.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

2—4 кастрычніка 1938 года адбыўся 3-ці пленум Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай Партыі (большэвікоў) Беларусі з удзелам сакратароў абкомаў, гаркомаў і РК КП(б)Б.

Пленум абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Аб выкананні рашэнняў Студзеньскага пленума ЦК ВКП(б).

2. Аб прыёме новых членаў у ВКП(б).

3. Аб парткіраўніцтве комсамолам.

4. Вынікі ўборкі ўраджаю, асенняй сяўбы і выканання дзяржаўных абавязкаў.

Па ўсіх вышэйуказаных пытаннях пленум прыняў адпаведныя рашэнні.

Апрача таго пленум разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

У сувязі з адкліканнем на іншую работу, пленум аслабаніў тав. Ананьева А. А. ад работы сакратара ЦК КП(б)Б.

Пленум выбраў у склад членаў бюро ЦК КП(б)Б тав. Кісялёва К. В. — старшыню Соўнаркома БССР і т. Матвеева А. П. — сакратара Менскага абкома КП(б)Б.

ВЫКАНАЦЬ ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПАСТАЎКІ І НАТУРАПЛАТУ

Большэвіцкая партыя і совецкі ўрад стварылі ўсе неабходныя ўмовы для росквіту калгаснага ладу, для росту заможнасці і багацця калгасаў і калгаснікаў. Калгаснае сялянства пагранічнай Совецкай Беларусі штодзенна адчувае сталінскія клопаты і любоў. Гэта натхняе мільённыя масы калгаснікаў у барацьбе за высокія ўраджаі, за рост прадукцыйнасці жывёлы, за заможнае і культурнае жыццё.

Адказваючы на гэту велізарную ўвагу і дапамогу партыі і ўрада, совецкае сялянства лічыць для сябе вялікім гонарам заўсёды своечасова выконваць усе дзяржаўныя пастаўкі і абавязковыя грашовыя плацяжы. Разам з уборкай багатага ўраджаю і пачаткам малацьбы першыя цэнтнеры залацістага збожжа непарыўным патокам пачынаюць паступаць у дзяржаўныя склады і элеватары. Для кожнага калгаса, кожнага калгасніка і аднаасобніка прамым абавязкам з'яўляецца — своечасова выканаць першую запаведзь перад совецкай дзяржавай — поўнасцю здаць усе пастаўкі і натураплату за работу МТС.

Калгасы, калгаснікі і аднаасобнікі пагранічнай Тураўшчыны 1 кастрычніка першымі ў рэспубліцы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па хлебапастаўках, звярнулі насенную ссуду і здалі натураплату за работу МТС. На 89,7 проц. калгасы гэтага раёна выканалі ўжо і план бульбапаставак.

Услед за Тураўшчынай да поўнага выканання плана хлебапаставак і натураплаты МТС набліжаюцца калгасы, калгаснікі 1 аднаасобнікі Прапойскага, Добрушскага, Веткаўскага і раду іншых раёнаў. Аднак у цэлым па загатоўцы хлеба наша рэспубліка недапушчальна адстае.

На 1 кастрычніка план абавязковых паставак, натураплаты за работы МТС і зварот калгасамі насеннай ссуды выканан толькі на 61,1 проц. У тым ліку план дзяржаўных паставак калгасамі выканан толькі на 94,4 проц., калгаснікамі з прысядзібных участкаў — на 24,4 проц., аднаасобнікамі — на 28 проц., здана калгасамі натураплаты за работу МТС — 50 проц., вернута калгасамі насеннай ссуды — 44 проц. і соўгасы здалі 77 проц.

Процант выканання плана хлебапаставак і натураплаты МТС па Магілеўскай і Менскай абласцях ніжэй рэспубліканскага — 58. У раёнах Расонскім, Дубровенскім, Жлобінскім, Рагачоўскім, Петрыкаўскім, Касцюковіцкім, Клічаўскім, Халопеніцкім, Барысаўскім і некаторых іншых план выкананы і таго менш — ад 37 да 50 проц.

Такое становішча магло здарыцца толькі таму, што кіраўнікі гэтых раёнаў і абласцей да апошняга часу, а ў радзе месц нават і зараз, па-сапраўднаму не кіравалі і не кіруюць выкананнем плана дзяржаўных паставак і натураплаты за работу МТС. Зараз у такіх раёнах, як Жлобінскі і інш., кінуліся ў другую крайнасць. У калгасы і сельсоветы пасланы дзесяткі ўпаўнаважаных, якія замест наладжвання масавай палітыка-выхаваўчай работы займаюцца зборам вестак, падмяняюць часта сельскія советы і нават старшынь калгасаў.

Такая штурмаўшчына апрача шкоды нічога карыснага прынесці не можа. Вялікай прычынай адставання Жлобінскага раёна па ўсіх відах дзяржаўных паставак і грашовых плацяжах з'яўляецца тое, што многія так званыя сельскія актывісты — члены сельсоветаў, старшыні калгасаў і нават сельсоветаў самі з'яўляюцца неакуратнымі плацельшчыкамі і не служаць прыкладам для астатніх. Так, старшыня калгаса імя М. Горкага Карабан, трымаючы ў індывідуальным карыстанні 4 галавы буйнай рагатай жывёлы, 6 авечак, 4 свіней і многа хатняй птушкі, не выканаў яшчэ даведзены да яго гаспадаркі план мясапаставак, не выплаціў сельгаспадатку, не выканаў паставак шэрсці. Гледзячы на такога гора-старшыню, не разлічваюцца з дзяржавай і многія калгаснікі.

Увільванне ад выканання дзяржаўных паставак многімі «актывістамі» Жлобінскага раёна характэрна і для раду іншых адстаючых раёнаў. Разам з гэтымі прычынамі недапушчальна маруднага ходу выканання хлебапаставак і натураплаты МТС усё яшчэ з'яўляюцца надзвычай нізкія ў радзе раёнаў тэмпы малацьбы. Не ўсюды яшчэ МТС поўнасцю ўручылі калгасам рахункі за праробленую імі работу. У сваю чаргу калгасы не лічаць патрэбным адначасова з выкананнем дзяржаўных паставак уносіць і натураплату за работу МТС.

У радзе месц работнікі Белзаготзярно з-за сваёй непаваротлівасці адпраўляюць назад збожжа калгасаў і аднаасобнікаў. Так, напрыклад, са складаў Мазыра і Калінкавіч па той прычыне, што несвоечасова былі падрыхтаваны памяшканні для прыёмкі збожжа, былі адпраўлены назад вялікія партыі хлеба.

Пры надзвычайна нізкім выкананні хлебапаставак па ўсёй рэспубліцы аднаасобным сектарам у такіх раёнах, як Ушацкім, Чашніцкім, Багушэўскім, Хоцімскім, Касцюковіцкім, Капаткевіцкім і Талачынскім, аднаасобнікі план хлебапаставак выканалі толькі ад 3 да 9 проц. У гэтых раёнах патураюць антыдзяржаўным тэнлэнцыям аднаасобнікаў, не прымаюць рашучых мер да злосных сабатажнікаў хлебапаставак. Кіраўнікі раёнаў і сельсоветаў, работнікі раённых упаўнаважаных Наркамата загатовак не напамінаюць аднаасобнікам аб усёй палітычнай важнасці своечасовага выканання іх прамых абавязкаў перад дзяржавай. Гэтым самым яны ставяць аднаасобныя гаспадаркі ў выгаднейшае становішча, чым калгасы.

Старшыня Паўлавіцкага сельсовета, Кіраўскага раёна, тав. Верабей не прымае ніякіх мер да злосных сабатажнікаў дзяржаўных паставак і грашовых плацяжоў аднаасобнікаў вёскі Кірылаўка. Аднаасобнікі гэтай вёскі засяваюць па 4—6 гектараў, а планы паставак ім даведзены толькі на 2 гектары, але і тыя яшчэ не выкананы. За такую мілasць да іх аднаасобнікі гэтай вёскі далі Вераб'ёву і работнікам сельсовета скасіць 5 гектараў сваёй сенажаці.

Патуранне злосным сабатажнікам абавязковых дзяржаўных паставак наглядаецца ў Дрыбінскім і радзе іншых раёнаў. Толькі гэтым можна вытлумачыць, што аднаасобны сектар рэспублікі недапушчальна зацягвае выкананне і плана — мясапаставак (50 проц. выканання да трохквартальнага плана), малакопаставак (22 проц. выканання гадавога плана).

У гэтым годзе калгасы нашай рэспублікі знялі высокі ўраджай. Гэта — вынік непераможнасці калгаснага ладу, створанага і кіруемага вялікай партыяй Леніна—Сталіна. У нас ёсць усе магчымасці ў самыя бліжэйшыя дні ліквідаваць ганебнае адставанне рэспублікі па выкананню абавязковых дзяржаўных паставак і натураплаты за работу МТС. Трэба толькі па-сапраўднаму партыйным і совецкім арганізацыям, работнікам загатоўчых органаў узяцца за гэту надзвычай важную дзяржаўную справу і па-большэвіцку арганізаваць яе.

Уключаючыся ў перадкастрычніцкае спаборніцтва, — справа гонару кожнага калгаса, соўгаса, кожнага калгасніка і аднаасобніка ў самыя бліжэйшыя дні поўнасцю разлічыцца з дзяржавай па абавязковых пастаўках і поўнасцю здаць натураплату за работу МТС.

ПАВЕДАМЛЕННІ АБ САМАЛЁЦЕ „РОДИНА"

МАСКВА, 5 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў 19 гадзін сакратар гаркома ВКП(б) Комсамольска Пегаў перадаў урадавай камісіі падрабязны план работ па аказанню дапамогі экіпажу «Родина». Ён паведаміў, што 5 кастрычніка ў 10 гадзін лётчык Сахараў вылятае да Расковай, скідвае ёй вымпел з месцазнаходжаннем самалёта «Родина», а таксама чатыры пары паляўнічых лыжаў. У 10 гадзін з другой машыны будзе скінут Расковай дэсант парашутыстаў у складзе двух чалавек.

Лётчык Дзеркунскі, які знайшоў Раскову, паведамляе наступнае: пасля таго, як я скінуў Расковай харчаванне і ўказаў ёй шлях да самалёта «Родина», яна хутка накіравалася ў паўночна-заходнім напрамку.

Разгавор па прамому проваду з горадам Комсамольскам

5 кастрычніка ў 1 гадзіну 05 мінут па маскоўскаму часу в горадам Комсамольскам-на-Амуры была ўстаноўлена прамая тэлеграфная сувязь. У Маскве ля апарата знаходзіўся член штаба ўрадавай камісіі па пералёту, Герой Совецкага Саюза палкоўнік Слепнёў. У Комсамольску да апарата падышоў сакратар гаркома ВКП(б) тав. Пегаў.

Тав. Слепнёў перадаў у Комсамольск указанні ўрадавай камісіі аб тым, каб не скідваць тав. Расковай радыёстанцыю, якая толькі затрудніць яе перасоўванне. Тав. Слепнёў запытаў Комсамольск аб гатоўнасці самалёта да вылету для нагляду за перасоўваннем штурмана самалёта «Родина» т. Расковай. Ён падкрэсліў, што гэта найпярвейшая задача.

Затым тав. Слепнёў прасіў перадаць весткі аб перасоўванні пешых партый да самалёта «Родина» і аб падрыхтоўцы двух парашутыстаў, якіх намечана скінуць паблізу Расковай, калі яна яшчэ знаходзіцца далёка ад самалёта «Родина».

Тав. Пегаў паведаміў, што самалёты, назначаныя для нагляду за перасоўваннем Расковай, вылятаюць у 9 гадзін раніцы па мясцовому часу. У Кербі для выяснення стану пасадачнай пляцоўкі самалётаў накіроўваецца лётчык тав. Овечкін. Яму-ж даручана праверыць, як прасоўваюцца па рацэ Амгунь каперы, накіроўваючыся да пункта, да якога павінен выйсці экіпаж «Родина» і парашутысты.

У 2 гадзіны 55 мінут па маскоўскаму часу лётчык тав. Сахараў вылецеў да М. Расковай на самалёце «ПС-7». Ён павінен быў скінуць ёй прадукты. Адначасова з Комсамольска в тым-жа заданнем вылецеў гідрасамалёт «МП-1» пад кіраваннем пілота тав. Раманава.

Калі самалёты дасягнулі раёна месцазнаходжання тт. Грызадубавай і Осіпенка, лётчык Сахараў паведаміў па радыё, што бачыць людзей, накіроўваючыхся да самалёта «Родина».

Неўзабаве-ж з борта самалёта тав. Сахарава была атрымана другая радыёграма. Пілот перадаў, што ён дасягнуў месца прызямлення тав. Расковай.

У 4 гадзіны 45 мінут з Кербі ў Комсамольск вылецеў лётчык тав. Овечкін, які абследваў гэты раён в мэтай выяснення ўмоў пасадкі самалётаў.

У 8 гадзін 15 мінут зноў адбыўся разгавор з Комсамольскам, адкуль паведамілі, што тт. Грызадубавай і Осіпенка, а таксама парашутыстам, якія апусціліся да іх учора з самалётаў, скінуты дзве скрыні яблыкаў.

У Комсамольск быў перадан загад аб тым, што калі тав. Раскова прыдзе да самалёта «Родина», увесь экіпаж павінен неадкладна накіравацца да ракі Амгунь. Ля ракі экіпаж «Родина» і суправаджаючыя яго таварышы павінны чакаць вялікіх румавых лодак, якія ім будуць скінуты з самалёта.

МЕСЦА ЗНАХОДЖАННЯ САМАЛЁТА „РОДИНА"

Кароткая геаграфічная даведка

▲ РАЙОН МЕСТОНАХОЖДЕНИЯ САМОЛЕТА „РОДИНА"

Раён ракі Кербі, дзе знойдзен самалёт «Родина», адзін з самых глухіх і ніжкадаступных участкаў Далёкага Усхода. Рака і яе прытокі праразаюць усходні схіл Бурэйскага хрыбта. У вярхоўях ракі горы месцамі ўзнімаюцца да 2.000 метраў. Яны пазбаўлены раслінасці. Такія аголеныя вяршыны ў Сібіры называюцца «гольцамі».

Горныя схілы і даліны рэк пакрыты густой некранутай тайгой, у якой растуць аянская ель, піхта і бяроза. У таежных нетрах водзяцца мядзведзі. Быстрая невялікая рэчка ў верхнім сваім цячэнні багата парогамі і перакатамі. Ніжэй яна цячэ спакайней.

Пасёлак Кербі знаходзіцца ў 392 км. ад Нікалаеўска-на-Амуры, у раёне ракі Амгунь. З Нікалаеўска туды ходзяць судны. Непадалёку ад Кербі знаходзяцца залатыя прыіскі «Вясёлая горка» і «Раздолле». У прыіскавых пасёлках па 10—15 дамоў. Адразу-ж за Кербі пачынаюцца высокія горы.

Прабрацца ў гэты раён вельмі цяжка.

СПАБОРНІЦТВА НА ЛЕПШУЮ ПАСТАНОЎКУ АБАРОННАЙ РАБОТЫ

З кожным днём усё больш прадпрыемстваў, калгасаў і ўстаноў БССР уключаюцца ў соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую пастаноўку масавай абароннай работы. У многіх раёнах рэспублікі праводзяцца сходы працоўных, на якіх абмяркоўваецца заклік калгаснікаў сельскагаспадарчай арцелі імя Чапаева, Залатаношскага раёна, Палтаўскай вобласці (УССР). Працоўныя бяруць на сябе абавязацельствы аб вывучэнні ваеннай справы, аб яшчэ большым умацаванні абароназдольнасці нашай радзімы.

Калгаснікі калгаса «Чырвоны сцяг», Валокскага сельсовета, Хойніцкага раёна, абмеркаваўшы заклік чапаеўцаў, у прынятай рэзалюцыі пішуць: «У адказ на праданову калгаснікаў калгаса імя Чапаева, мы абавязваемся палепшыць абаронную работу ў калгасе, уцягнуць у рады Асоавіяхіма кожнага калгасніка і калгаснічку, палепшыць работу існуючага ў нас гуртка па падрыхтоўцы варашылаўскіх стралкоў і коннікаў. Мы абавязваемся ажывіць работу гурткоў ГСА і ППХА. Кожны з нас авалодае адной з ваенных спецыяльнасцей».

Трактарысты брыгады № 1, Папаратнянскай МТС, Жлобінскага раёна, рашылі арганізаваць у сваёй брыгадзе гурток па вывучэнню ваеннай справы. Члены слуцкай трыкатажнай арцелі «Ударнік» у прынятай на сходзе рэзалюцыі заяўляюць:

«Мы ставім сваёй задачай у бліжэйшы час уцягнуць усіх работнікаў у члены Асоавіяхіма. Яшчэ больш узмацнім работу групы самаабароны, гурткоў ППХА, ГСА і варашылаўскіх стралкоў. Рыхтуючыся да XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі, правядзем масавы ваенізаваны паход у прапівагазах».

У АПОШНЮЮ МІНУТУ

ПРЭЗІДЭНТ ЧЭХАСЛАВАКІІ БЕНЕШ СКЛАЎ СВАЕ ПАЎНАМОЦТВЫ

ПРАГА, 5 кастрычніка. (БЕЛТА). Прэзідэнт рэспублікі Бенеш склаў свае паўнамоцтвы. Бенеш выступіў па радыё з ізлажэннем матываў свайго рашэння.

У паінфармаваных колах мяркуюць, што ўход Бенеша, апрача іншых акалічнасцей, выклікан моцным націскам Берліна Патрабаванні Германіі ў гэтым пытанні былі, як тут указваюць, трэцяга дня прыняты Францыяй і Англіяй.

Па чэхаславацкай канстытуцыі на працягу 15 дзён пасля складання паўнамоцтва прэзідэнтам павінен быць склікан нацыянальны сход (абедзве палаты парламента) для выбараў новага прэзідэнта. Аднак, тут мяркуюць, што скліканне нацыянальнага схода будзе адкладзена да сканчэння плебісцыта ў раёнах са змяшаным насельніцтвам і выбараў новага парламента. Да гэтага часу прэзідэнта будзе, як відаць, замяшчаць глава ўрада генерал Сыровы.

Экіпаж самалёта «Родина» разглядае на карце маршрут дальняга беспасадачнага пералёту Масква — Далёкі Ўсход (злева направа): штурман — старшы лейтэнант М. М. Раскова, другі пілот — капітан П. Д. Осіпенка і камандзір самалёта—лётчык В. С. Грызадубава. Малюнак Я. Кашкеля па фото М. Бериштэйна («Правда»).

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

АБ КЛАСІФІКАЦЫІ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БЕЛАРУСКАЙ ССР

1. Усе населеныя пункты БССР раздзяліць на дзве катэгорыі: пасяленні гарадскога тыпу і пасяленні сельскага тыпу.

2. Да катэгорыі пасяленняў гарадскога тыпу аднесці гарады, рабочыя пасёлкі і гарадскія пасёлкі.

3. Зацвердзіць наступны спісак пасяленняў гарадскога тыпу:

а) гарады:

Гарады абласнога падпарадкавання:

1. Бабруйск (Магілеўская вобласць)
2. Барысаў (Менская вобласць)
3. Віцебск (Віцебская вобласць)
4. Гомель (Гомельская вобласць)
5. Менск (Менская вобласць)
6. Магілеў (Магілеўская вобласць)
7. Мазыр (Палеская вобласць)
8. Орша (Віцебская вобласць)
9. Полацк (Віцебская вобласць)
10. Рэчыца (Гомельская вобласць)
11. Слуцк (Менская вобласць).

Гарады раённага падпарадкавання:

1. Быхаў (Магілеўская вобласць)
2. Ветка (Гомельская вобласць)
3. Горкі (Магілеўская вобласць)
4. Гарадок (Віцебская вобласць)
5. Дзержынск (Менская вобласць)
6. Добруш (Гомельская вобласць)
7. Дрыса (Віцебская вобласць)
8. Дуброўна (Віцебская вобласць)
9. Жлобін (Гомельская вобласць)
10. Калінкавічы (Палеская вобласць)
11. Клімавічы (Магілеўская вобласць)
12. Касцюковічы (Магілеўская вобласць)
13. Крычаў (Магілеўская вобласць)
14. Лепель (Віцебская вобласць)
15. Мсціслаўль (Магілеўская вобласць)
16. Асіпавічы (Магілеўская вобласць)
17. Петрыкаў (Палеская вобласць)
18. Рагачоў (Гомельская вобласць)
19. Сянно (Віцебская вобласць)
20. Старыя Дарогі (Менская вобласць)
21. Чавусы (Магілеўская вобласць)
22. Чэрвень (Менская вобласць)
23. Чэрыкаў (Магілеўская вобласць)
24. Шклоў (Магілеўская вобласць)

б) рабочыя пасёлкі:

1. Барань (Віцебская вобласць)
2. Ветрынка (Магілеўская вобласць)
3. Высачаны (Віцебская вобласць)
4. Глуша (Магілеўская вобласць)
5. Градзянка (Магілеўская вобласць)
6. Елізава (Магілеўская вобласць)
7. Капцэвічы (Палеская вобласць)
8. Касцюкоўка (Гомельская вобласць)
9. Ноўкі (Віцебская вобласць)
10. Орэхі-Выдрыца (Віцебская вобласць)
11. Аршанскі-чыгуначны (Віцебская вобласць)
12. Асінторф (Віцебская вобласць)
13. Якаўлевічы (Віцебская вобласць)
14. Ясень (Магілеўская вобласць)

в) гарадскія пасёлкі:

1. Бягомль (Менская вобласць)
2. Бялынічы (Магілеўская вобласць)
3. Бярэзіно (Магілеўская вобласць)
4. Бешанковічы (Віцебская вобласць)
5. Багушэўск (Віцебская вобласць)
6. Брагін (Палеская вобласць)
7. Буда-Кашалёва (Гомельская вобласць)
8. Глуск (Палеская вобласць)
9. Ельск (Палеская вобласць)
10. Жыткавічы (Палеская вобласць)
11. Заслаўль (Менская вобласць)
12. Капаткевічы (Палеская вобласць)
13. Клічаў (Магілеўская вобласць)
14. Копыль (Менская вобласць)
15. Копысь (Віцебская вобласць)
16. Карма (Гомельская вобласць)
17. Краснаполле (Магілеўская вобласць)
18. Крупкі (Менская вобласць)
19. Красная Слабада (Менская вобласць)
20. Лагойск (Менская вобласць)
21. Лельчыцы (Палеская вобласць)
22. Лёзна (Віцебская вобласць)
23. Лоеў (Гомельская вобласць)
24. Любань (Менская вобласць)
25. Ляды (Віцебская вобласць)
26. Марына-Горка (Менская вобласць)
27. Нароўля (Палеская вобласць)
28. Негарэлае (Менская вобласць)
29. Асвея (Віцебская вобласць)
30. Парычы (Палеская вобласць)
31. Плешчаніцы (Менская вобласць)
32. Прапойск (Магілеўская вобласць)
33. Рудзенск (Менская вобласць)
34. Смалявічы (Менская вобласць)
35. Старобін (Менская вобласць)
36. Стрэшын (Гомельская вобласць)
37. Сураж (Віцебская вобласць)
38. Талочын (Віцебская вобласць)
39. Тураў (Палеская вобласць)
40. Уваравічы (Гомельская вобласць)
41. Узда (Менская вобласць)
42. Ула (Віцебская вобласць)
43. Урэ'е (Менская вобласць)
44. Ушачы (Віцебская вобласць)
45. Хойнікі (Палеская вобласць)
46. Халопенічы (Менская вобласць)
47. Хоцімск (Магілеўская вобласць)
48. Церахоўка (Гомельская вобласць)
49. Чашнікі (Віцебская вобласць)
50. Чачэрск (Гомельская вобласць)
51. Шуміліна (Віцебская вобласць)
52. Янавічы (Віцебская вобласць)

4. Усе астатнія населеныя пункты, не пералічаныя ў арт. 3 гэтага Указа, лічыць пасяленнямі сельскага тыпу.

5. У сувязі з выданнем гэтага Указа пастанову ЦВК і СНК БССР ад 15/VII-35 г. «Аб зацвярджэнні спіска гарадоў, рабочых пасёлкаў і мястэчак у БССР» (З. З. БССР за 1935 год № 26 паст. 143) лічыць страціўшай сілу.

6. Лічыць неабходным унясенне ў некаторыя артыкулы Канстытуцыі БССР змен, выцякаючых з гэтага Указа.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Н. НАТАЛЕВІЧ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Л. ПАПКОЎ.

27 верасня 1938 г.
г. Менск.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

МАЦАВАЦЬ СУВЯЗЬ З БЕСПАРТЫЙНЫМІ МАСАМІ

Партыйная арганізацыя Аршанскага ільнакамбіната здолела па-большэвіцку ўзначаліць кампанію па выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Комуністы завода і лепшы беспартыйны актыў штодня праводзілі палітычную агітацыю, накіраваную на ўмацаванне цеснай сувязі партыйных арганізацый з шырокімі масамі беспартыйных. Увесь калектыў нашага завода аднадушна аддаў свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за лепшых сыноў і дачок нашай радзімы.

Аднак, трэба прызнацца, што партыйная арганізацыя не здолела замацаваць поспехі, дасягнутыя ў часе выбараў. У рэзультаце гэтага партыйна-масавая і палітычна-выхаваўчая работа сярод беспартыйных аслабла. Дрэнна працуюць грамадскія арганізацыі — Асоавіяхім, МОПР і інш. Гутаркі ў цэхах праводзяцца час-ад-часу і не заўсёды да нашых рабочых даводзяць важнейшыя падзеі, што адбываюцца ў нашай краіне і за граніцай. Калі ў першай і другой зменах сёе-тое праводзіцца, то амаль ніякай палітычнай работы няма ў начной змене. Партыйны камітэт пытаннем разгортвання работы сярод беспартыйных займаўся вельмі слаба.

Такое становішча мела адмоўны ўплыў на разгортванне стахanаўскага руху. І зусім правільна зрабіў Віцебскі абком партыі, прызнаўшы работу парткома ў гэтай галіне нездавальняючай.

Аб слабай рабоце сярод беспартыйных сведчыць таксама і тое, што амаль няма ніякага росту ў групе спачуваючых. За 9 месяцаў гэтага года група спачуваючых вырасла ўсяго толькі на тры чалавекі.

Праўда, са спачуваючымі работа пастаўлена лепш. Адзін раз у месяц мы іх склікаем, даводзім да іх важнейшыя рашэнні партыі і ўрада. Усе спачуваючыя навучаюцца ў гуртках палітграматы. Спачуваючыя тт. Талстой і Петрачэнка з'яўляюцца чытчыкамі газет і бяседчыкамі ў цэхах.

Раней наш партком яднаў комуністаў ільнакамбіната і будаўнічага ўчастка. У сярэдзіне верасня з парт-арганізацыі былі створаны дзве асобныя партарганізацыі. Гэта дало магчымасць больш канкрэтызаваць кіраўніцтва, палепшыць усе галіны партыйнай работы.

У мінулым месяцы была праведзена спецыяльная нарада з беспартыйным актывам, на якой прысутнічала 120 чалавек. Абмяркоўваючы пытанне аб баявой сустрэчы XXI гадавіны Кастрычніцкай рэволюцыі, рабочы калектыў абавязаўся выканаць сваю гадавую праграму датэрмінова — да 12 снежня — слаўнай даты выбараў у Вярхоўны Совет СССР.

Партком заняўся работай фабрычнага камітэта. Заслухалі справаздачу аб яго рабоце, якая была прызнана нездавальняючай. Апарат фабкома зараз укамплектован, і яго работа значна палепшылася. Перыядычна праводзяцца вытворчыя нарады. Завялі дакладны ўчот стахanаўцаў і ўдарнікаў, выпрацавалі рад мерапрыемстваў па далейшаму разгортванню стахanаўскага руху.

За апошні час палепшылася і палітычная работа ў цэхах. Паўтара месяца таму назад 600 рабочых камбіната слухалі кваліфікаваны даклад аб міжнародным становішчы, падзеях у Чэхаславакіі, гераічнай барацьбе кітайскага і іспанскага народаў з міжнародным фашызмам.

Падводзячы вынікі нашай работы, трэба прама сказаць, што мы наказ комуністаў аб рабоце сярод беспартыйных і спачуваючых не выканалі. Наш баявы абавязак — па-большэвіцку рэалізаваць указанні комуністаў, якія павінны быць настольнай кнігай для ўсіх партыйных кіраўнікоў.

А. Н. РАМАНАЎ.
Сакратар парткома аршанскага ільнакамбіната.

РАСЦЕМ ЗА ЛІК ЛЕПШЫХ, АДДАНЫХ ПАРТЫІ ЛЮДЗЕЙ

Вынікі прайшоўшых выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ярка прадэманстравалі ўсяму свету, што працоўныя масы вялікага Совецкага Саюза бязмежна адданы сваёй социялістычнай радзіме, справе рабочага класа.

Аднадушна галасуючы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, совецкі народ тым самым галасаваў за справу партыі Леніна—Сталіна, аднадушна выражаючы сваю любоў і адданасць мудраму правадыру і настаўніку совецкага народа таварышу Сталіну.

У дні падрыхтоўкі выбараў беларускага парламента ў Рагачоўскім раёне працавала звыш тысячы агітатараў. Зараз працуюць 42 агіткалектывы з ахопам 742 агітатараў. Гэта выдатны рэзерв, адкуль партыйная арганізацыя папаўняе свае рады.

Карыстаючыся давер'ем комуністычнай партыі і давер'ем народа, маладыя агітатары раслі на грамадскай рабоце. У іх свядомасці ўмацавалася пачуцце адказнасці за даручаную справу.

Агітацыйна-масавая работа з'явілася выдатнай школай для новых большэвіцкіх кадраў. Аб гэтым ярка сведчыць прыток заяў ад беспартыйных агітатараў — рабочых, калгаснікаў, настаўнікаў, студэнцтва — аб прыёме ў партыю Леніна—Сталіна. Калі за 1937 год было прынята ў партыю 5 чал., то з 1 студзеня па 25 верасня 1938 г. прынята ў кандыдаты партыі 88 і ў члены 28 чалавек, з іх 15 жанчын, 44 члены ЛКСМБ, 17 рабочых, 28 калгаснікаў.

У партыю ўступаюць лепшыя людзі нашай краіны, актыўныя ўдзельнікі социялістычнага будаўніцтва, прамысловасці і сельскай гаспадаркі, актывісты выбарчай кампаніі, майстры большэвіцкай агітацыі. Вось прыклады.

Рабочы-слесар камбіната тав. Іваноў, стахanавец на вытворчасці. У перыяд выбараў быў добрым агітатарам на выбарчым участку. Пасля выбараў уступіў у кандыдаты партыі.

Тав. Мельнікаў — рабочы лесазавода — быў членам выбарчай участковай камісіі, які актыўна прымае ўдзел у падрыхтоўцы да выбараў і цяпер актыўна працуе ў агіткалектыве лесазавода. Ён таксама прынят у кандыдаты ВКП(б).

На гэтым-жа заводзе комсамолка-актывістка, малады інжынер тав. Стасенка Ніна Грыгор'еўна ў перыяд выбараў у Вярхоўны Совет СССР была даверанай асобай на выбарчым участку. Пасля выбараў кіруе агіткалектывам завода.

Тав. Стасенка выбрана дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР. Тав. Стасенка цяпер з'яўляецца кандыдатам большэвіцкай партыі.

Прыняты ў партыю былая калгасніца, цяпер загадчык аддзелам аховы здароўя, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Мінава, стахanаўка па ільну калгаса імя Ежова тав. Святцава Матрона Карнеева, трактарыстка тав. Мільячэнка, рабочы лесазавода тав. Васільеў, рабочыя картфабрыкі тт. Стрэльцаў, Ворачкіна, старшыні калгасаў тт. Праснякоў, Мурзянкоў; прыняты таксама лепшыя агітатары і кіраўнікі сельскіх агіткалектываў настаўнікі-комсамольцы тт. Паўлаў, Барысаў, Котлінскі і інш.

Пры прыёме ў партыю строга выконваюцца ўказанні ЦК ВКП(б) аб індывідуальным падыходзе да прыёму новых членаў ВКП(б). Рост радоў партыі даў магчымасць арганізаваць 9 новых пярвічных партарганізацый на вёсцы. Усе новапрынятыя комуністы і спачуваючыя ахоплены партвучобай, маюць даручэнні, якія з поспехам імі выконваюцца.

У мэтах яшчэ большага набліжэння актыва да партыі арганізаваны для пізавога сельсоэцкага актыва палітгурткі пры сельсоветах і калгасах. Рад пярвічных партарганізацый заслуханы на бюро РК КП(б)Б і ім даны практычныя ўказанні па арганізацыі прыёму ў партыю і работы з беспартыйнымі масамі. Гэтыя мерапрыемствы спрыялі росту нашай партарганізацыі.

Але, не гледзячы на рост партарганізацыі, усё-ж ёсць рад істотных недахопаў. Да іх трэба аднесці недастатковы прыём у партыю калгаснікаў; маруднае афармленне дакументаў па прыёму комсамольцаў у партыю (з рэкамендаваных РК КСМ 86 чал. прынята толькі 44).

Выконваючы ўказанні нашай партыі, рагачоўская партарганізацыя ліквідуе недахопы яшчэ большым умацаваннем сувязі з беспартыйнымі працоўнымі масамі і няспынна будзе працаваць над расшырэннем сваіх радоў за лік лепшых і адданых партыі людзей.

І. Е. ВАСІЛЬЕЎ.
Сакратар Рагачоўскага РК КП(б)Б.

ЦЭНТР ПАРТЫЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ

Мне даручылі адказную і пачэсную справу: мяне, рабочага ад станка, не так даўно вылучылі загадчыкам партыйным кабінетам. Вопыту ў рабоце не было. Спачатку нават не верыў, за што ўзяцца. Але мне дапамаглі. Райком партыі прымацаваў вопытнага таварыша. Ён мяне вучыў, дапамагаў разгортваць партыйную прапаганду на заводзе. І так справа пайшла. Прапаваць у партыйным кабінеце — справа вельмі захапляючая, і я з вялікай цікавасцю ўзяўся за яе.

Не так даўно арганізаваў тэарэтычную канферэнцыю аб 35-годдзі РСДРП. Гэта канферэнцыя мела недахоп — на ёй выступаў толькі адзін дакладчык. Зараз рыхтую тэарэтычную канферэнцыю на тэму аб Пражскай канферэнцыі. Улічыўшы недахопы мінулага, зараз да гэтай канферэнцыі рыхтуюцца тры дакладчыкі.

Асноўная задача, якую ставіць перад сабой партыйны кабінет, — гэта добра падрыхтавацца да глыбокага вывучэння гісторыі большэвіцкай партыі. Падрыхтоўку мы пачалі з таго, што правялі спецыяльныя партыйныя і комсамольскія сходы, на якіх абмеркавалі перадавыя артыкулы «Правды». Партком вылучыў і зацвердзіў 16 прапагандыстаў, з якімі ўжо быў праведзен семінар.

Улічваючы вялікае імкненне да вывучэння гісторыі ВКП(б) беспартыйных рабочых, мы арганізоўваем для іх спецыяльныя гурткі. Як вядома, раней у нас адставала партыйная вучоба толькі таму, што камплектаванне гурткоў праходзіла без уліку падрыхтаванасці комуністаў. Зараз састаў гурткоў перагледжан, слухачы падбіраюцца з аднолькавым узроўнем падрыхтоўкі.

Працуючы загадчыкам партыйным кабінетам, неабходна няспынна павышаць свой ідэйна-палітычны ўзровень. У сувязі з падзеямі ў Чэхаславакіі да мяне прыходзяць рабочыя з рознымі пытаннямі. Я, добра разабраўшыся па карце, прачытаўшы матэрыялы ў газетах, праводжу з імі гуткі.

Асабіста я наведваю семінар прапагандыстаў пры райкоме партыі і кірую гуртком спачуваючых па вывучэнню статута і праграмы нашай партыі.

Трэба адзначыць, што калі мне з пачатку работы ў парткабінеце аказвалі дапамогу, то зараз я яе не бачу. Райком партыі нас збірае вельмі рэдка, а патрэбна было-б, каб для абмену вопытам збіралі ўсіх загадчыкаў партыйных кабінетаў горада, што з'явілася-б для нас лепшай школай.

І. Д. БАЛОТНІКАЎ.
Загадчык парткабінетам бабруйскага завода імя Кірава.

ДЭПУТАТ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПРЫНЯТ У ПАРТЫЮ

ХОЙНІКІ. Райком партыі прыняў кандыдатам у члены КП(б)Б памочніка брыгадзіра трактарнай брыгады — дэпутата Вярхоўнага Совета БССР Юлію Пятроўну Малянок.

У кандыдаты партыі таксама прынят лепшы машыніст малатарні — ордэнаносец Кандрат Ефімавіч Свірыд. Тав. Свірыд да 1 кастрычніка выканаў гадавое заданне на 158 проц., намалаціўшы 637 тон збожжа.

Трэці сакратар Камарынскага райкома КП(б)Б тав. Серыкаў праводзіць семінар з прапагандыстамі аб Кароткім курсе гісторыі ВКП(б). Фото Я. Салавейчыка.

ПАДРУГІ

Камандзіру экіпажа самалёта «Родина» Валенціне Грызадубавай 28 год. Але за яе плячыма ўжо дзесяцігадовы стаж лётнай работы.

Любоў да авіяцыі Валенціна Грызадубава ўнаследвала ад бацькі Сяпана Грызадубава, таленавітага авіяканструктара-самавучкі. 14 год яна ўжо лятала на планерах, пабудованых бацькам. У 1928 годзе Грызадубава, студэнтка Харкаўскага тэхналагічнага інстытута, паступае ў лётную школу.

Часам ёй было нялёгка. Нямногія тады верылі, што з дзяўчат, прышоўшых у авіяцыю, выйдзе толк.

Сустрэча з тав. Г. К. Орджанікідзе— адзін з самых радасных дзён у жыцці Валенціны Грызадубавай — рассеяла ўсе яе сумненні.

Нарком ласкава сустрэў маладую дзяўчыну. Уважліва выслухаў яе.

— Я веру табе, — сказаў тав. Орджанікідзе. — Лятаць будзеш, станеш лётчыкам — заходзь да мяне і расказвай аб сваіх дасягненнях.

Грызадубава з поспехам—за тры месяцы — кончыла лётную школу. Адна з гэтых першых у Асоавіяхіме дзяўчына-пілот стала пілотам-інструктарам.

86 яе выхаванцаў сядзяць за штурвалямі самалётаў. Яе вучні ўжо самі даўно сталі настаўнікамі. Многія з іх камандзіры РСЧА, ордэнаносцы.

З 1934 года Грызадубава — агітатар агітэскадрыллі імя Горкага. Яна абляцала амаль усю нашу велізарную краіну — ад Паміра да Байкала.

Гарачы грамадскі работнік, Валенціна Сяпанаўна вядзе вялікую работу ў часці РСЧА, дзе служыць яе муж, ваенны лётчык. У 1936 годзе ўрад узнагароджвае яе ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. За выдатнае авалоданне авіяцыйнай тэхнікай урад узнагароджвае яе ў 1937 годзе другім ордэнам — Чырвонай Звязды.

Няспынна ўдасканальваючы сваё майстэрства, Валенціна Грызадубава становіцца выпрабавальнікам новых машын.

На працягу кароткага часу Валенціна Грызадубава ставіць некалькі жаночых рэкордаў, значна перакрываючы міжнародныя дасягненні праслаўленых амерыканскіх лётчыц.

Совецкая краіна любіць і цэніць сваіх герояў. Прапоўныя Чуйскай выбарчай акругі, Кіргізкай ССР, выбралі Грызадубаву сваім дэпутатам у Вярхоўны Совет СССР.

***

Каля дзевяці год назад адбылося першае знаёмства раённага арганізатара птушкагадоўчых ферм Паліны Осіпенка з авіяцыяй. На вёсцы, дзе яна была, выпадкова спусціліся два спартыўныя самалёты. З таго часу думка аб прафесіі лётчыка не пакідала Осіпенку.

Паліна едзе ў Севастопаль і там паступае на работу ў сталовую школы лётчыкаў. Партыйная арганізацыя школы даведваецца аб яе імкненні, дапамагае ёй пайсці на вучобу.

І пачалася доўгая, напружаная вучоба. У канцы 1932 года Паліна Осіпенка канчае школу на «добра». Яна— ваенны лётчык РСЧА. Працуе яна ўзорна і праз некаторы час прызначаецца камандзірам звяна. Комуністка, выдатны лётчык, яна ніколі не спыняе вучобы, вядзе вялікую грамадскую работу сярод сем'яў начальніцкага састава. Асвоіўшы многа тыпаў самалётаў, яна пачынае займацца высотнымі палётамі і абганяе ўсіх лётчыкаў сваёй часці, у тым ліку і свайго мужа.

У 1936 годзе яна прымае ўдзел ва Усесаюзнай нарадзе жонак камандзнага і начальніцкага састава РСЧА. Урад узнагароджвае яе ордэнам Чырвонага Сцяга. Яна дае абяцанне таварышу Сталіну лятаць яшчэ лепш і выконвае сваё слова.

У табліцу Міжнароднай авіяцыйнай федэрацыі ўжо ўпісаны 6 рэкордаў П. Д. Осіпенка.

Паліна Дзянісаўна рыхтуецца да паступлення ў Ваенна-паветраную акадэмію, заканчвае вячэрні рабфак пры Доме Чырвонай Арміі. Але адначасова яна рыхтуецца да новага незвычайнага пералёту ад берагоў Чорнага мора да берагоў Белага мора. 2 ліпеня 1938 года Паліна Осіпенка са сваімі баявымі падругамі Верай Ламака і Марынай Расковай бліскуча зрабіла гэты пералёт.

«Ганарымся мужнасцю, вытрыманасцю і высокім майстэрствам совецкіх жанчын-лётчыц, якія ўпісалі сваім бліскучым пералётам яшчэ адзін рэкорд у гісторыю совецкай авіяцыі».

Гэтыя прывітальныя словы правадыра народаў таварыша Сталіна і яго саратнікаў выразілі пачуцці ўсяго народа. Урад узнагародзіў адважных лётчыц ордэнам Леніна. Загадам наркома абароны маршала Совецкага Саюза тав. К. Е. Варашылава тав. Осіпенка было прысвоена ваеннае званне капітана, а тав. Расковай — старшага лейтэнанта.

***

Пасля гэтага пералёту ў Архангельск Паліна Осіпенка і Марына Раскова пачалі рыхтавацца да новага, яшчэ больш выдатнага пералёту.

Самая маладая ўдзельніца пералёту—Марына Міхайлаўна Раскова—нарадзілася ў 1912 годзе. З дзіцячых год яна марыла аб палётах. Скончыўшы сярэднюю школу, 16-гадовай дзяўчынай Марына пайшла працаваць на завод лабаранткай. Гэта было вельмі далёка ад авіяцыі.

Але вось яна пераходзіць на работу ў лабараторыю Ваенна-паветранай акадэміі РСЧА імя Жукоўскага, паступае на аэранавігацыйны факультэт завочнага інстытута Грамадзянскага паветранага флота.

Начальнік лабараторыі А. В. Белякоў, зараз Герой Совецкага Саюза, звачае ўвагу на маладую, удумлівую, здольную жанчыну, якая марыла аб прафесіі штурмана. Ён вучыць яе, бярэ з сабою ў палёты.

Марына Раскова канчае ВНУ, атрымлівае дыплом штурмана. Сваёй спецыяльнасцю яна валодае ў дасканаласці. Ёй даверяюць выкладанне ў акадэміі, яна інструктуе лётчыкаў-назіральнікаў. Сярод яе вучняў — нямала выдатных штурманаў ваеннай авіяцыі.

Адначасова з вывучэннем штурманскай справы Раскова заканчвае лётную школу. Штурман-пілот Марына Раскова працуе інструктарам па сляпых палётах. У якасці штурмана яна лятала з Валенцінай Грызадубавай у 1937 годзе па прамой на лёгкаматорным спартыўным самалёце. Яны ўстанавілі новы міжнародны рэкорд, праляцеўшы без пасадкі да Акцюбінска 1.444 кілометры.

***

Рознымі шляхамі прышлі гэтыя тры жанчыны да авіяцыі. Але адно парадняе іх: доблесць, майстэрства, гатоўнасць перамагаць у імя сваёй вялікай радзімы.

ВАЛЕНЦІНА ГРЫЗАДУБАВА

Камандзір самалёта «Родина», дэпутат Вярхоўнага Совета СССР

МАРА

Я даўно марыла аб далёкім пералёце. Для нас, совецкіх лётчыкаў, «марыць» аб пералёце — гэта значыць рыхтавацца да яго, трэніравацца. Самыя дзерзнавенныя мары ажыццяўляюцца ў нашай цудоўнай радзіме.

У мінулым годзе разам з Марынай Расковай я зрабіла палёт у Акцюбінск. Мы ўстанавілі тады рэкорд, пакрыўшы без пасадкі ад Масквы 1444 кілометры.

Адразу пасля гэтага я пачала рыхтавацца да новага пералёту. Мы распылі пабіць міжнародны жаночы рэкорд палёту на дальнасць па прамой лініі.

З яшчэ большым энтузіязмам я стала рыхтавацца да палёту пасля таго, як я гутарыла з таварышам Сталіным у адзін з ліпеньскіх дзён 1938 года. Не прыходзіцца гаварыць аб радасным хваляванні, якое я адчула ў той дзень. Мне прадстаяла ўпершыню гутарыць з чалавекам, імя якога ўсе совецкія лётчыкі, усе працоўныя свету называюць з пачуццём сыноўяй любві.

Заходжу ў пакой. Тут таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, К. Е. Варашылаў, Н. І. Ежоў, камандарм 2-га ранга А. Д. Лакціонаў, лётчыкі Героі Совецкага Саюза М. М. Громаў, М. Ю. Алексееў.

Іосіф Вісарыёнавіч пытаўся ў мяне аб маршруце пералёту, аб машыне. Аб трываласці машыны ён запытаў таксама ў тт. Громава і Алексеева, якія выпрабоўвалі самалёт. На стале ляжала карта, і я, указваючы па ёй, падрабязна далажыла аб маршруце. Таварыш Сталін адобрыў яго, зрабіўшы па плану пералёту рад глыбокіх і сур'ёзных заўваг. Іосіф Вісарыёнавіч часта падыходзіў да карты і зноў рабіў некаторыя важныя ўказанні. У прыватнасці, таварыш Сталін прапанаваў стварыць у некаторых раёнах трасы пералёту, асабліва ў паўночнай аканечнасці возера Байкал, дадатковыя радыёстанцыі.

Цёплая гутарка, якой мне ніколі не забыць, прадаўжалася каля двух гадзін. Кожнае слова Сталіна я ў думках паўтарала пра сябе, каб назаўсёды захаваць у памяці гутарку з вялікім правадыром народаў.

У канцы гутаркі я далажыла таварышу Сталіну аб экіпажы самалёта. Іосіф Вісарыёнавіч запытаў мяне, ці дружны падабрала я экіпаж.

Экіпаж дружны. Мы добра ведаем адзін аднаго. Мой другі пілот — Паліна Осіпенка вядома сваім майстэрствам усёй краіне. Марына Раскова — вельмі добры штурман.

Мы пачалі штодзённа і ўпарта трэніравацца. Шмат палётаў мы зрабілі ўсляпую. Герой Совецкага Саюза С. А. Данілін, які ўдзельнічаў у адным з трэніровачных палётаў, вельмі хваліў абсталяванне самалёта.

Мы адчуваем любоўныя клопаты, з якімі стахanаўцы-рабочыя, інжынеры і тэхнікі снарадзілі нас у дарогу, абсталявалі нашу машыну. Дзякуй за гэта ім. Дзякуй нашаму вялікаму другу, таварышу Сталіну! З імем яго ў сэрцы і на вуснах мы вылецелі ў наш адказны палёт. Над вялікімі прасторамі нашай краіны мы пранясем дарагое і любімае мільёнамі совецкіх патрыётаў свяшчэннае слова «радзіма».

Масква, Шчолкаўскі аэрадром, 24 верасня.

ЭПІЗОДЫ ГЕРАІЧНЫХ БАЁЎ ЛЯ ВОЗЕРА ХАСАН

СУСТРЭЧА НА ПАЗІЦЫІ

Быў яркі сонечны дзень. Але на ўсходзе згушчаліся змрочныя хмары. У раёне возера Хасан разгарэўся бой. Няспынна грукаталі гарматныя залпы. Артылерысты пачалі падрыхтоўку да атакі.

Пад прыкрыццём артылерыйскага і кулямётнага агню падняваліся да зыходных становішчаў стралковыя часці. Ад укрыцця да ўкрыцця, браскамі, праз вяршыны сопак і грэбняў ішлі аддзяленні і ўзводы да перадавых пазіцый.

Кожны раз, калі сустракаліся на шляху наступлення батарэі, малодшы камандзір — комсамолец тав. Хапанцаў пільна ўглядаўся ў твары байцоў, што ля гармат. Дзесьці павінен быць яго брат. І вось ён бачыць, як каранастая постаць артылерыста быстра ўклала ў гармату снарад і кінулася ў бок. Сваім рухам яна нагадала Хапанцову нешта роднае і знаёмае.

— Ён, Нікіта! — радасна прашаптаў Косця. І як толькі раздаўся стрэл, ён не вытрымаў і закрычаў:

— Нікіта! Хапанцаў!

Пачуўшы знаёмы голас, артылерыст абярнуўся і ўбачыў, як падняўся і накіраваўся да яго чырвонаармеец.

— Косця, ці ты гэта? Нікіта моцна, па-артылерыйску сціскаў працягнутыя рукі брата. Доўга ўглядаліся ў румяныя, загарэлыя твары.

— У наступленне ідзеш? — нарэшце спытаў Нікіта. — Глядзі, будзь асцярожным, лепш маскіруйся.

— Ну, што ты, — спяшыў перабіць яго Косця. — Ты за мяне будзь спакойны. Нас з табою могуць у кожную мінуту замяніць браты. Ад Ляонція атрымаў пісьмо, шкадуе, што іх часці сюды не пасылаюць, ён у палкавой школе.

— А я атрымаў ад Мішы і Федзі з калгаса: пішуць, што гатовы ў любую мінуту прыехаць да нас і грудзьмі змагацца за шчаслівае калгаснае жыццё, — таксама паспешна паведаміў яго Нікіта.

Сустрэча была мінутнай. Браты разышліся радасныя, шчаслівыя.

І калі Хапанцаў дагнаў аддзяленне, то яго першымі словамі былі:

— Таварышы, у атаку ісці дружна, не адставаць ад мяне ні на крок.

Калі раздалася каманда Хапанцава «У атаку, за мной!», — чырвонаармеец Качарэжка выскачыў за камандзірам першым і голасна ўсклікнуў:

«За Сталінскую Канстытуцыю, за Сталіна, за радзіму-маці, наперад, таварышы, ура!»

Нішто не магло стрымаць рвучыхся байцоў наперад з імем вялікага правадыра Сталіна. Вораг быў адкінут. Совецкая зямля ачышчана ад японскіх захватчыкаў. На вышыні Заазёрная горда ўзвіўся чырвоны сцяг, дэманструючы магутнасць вялікага Совецкага Саюза.

На другі дзень пасля заняцця вышыні аддзяленню трэба было папоўніць баявы запас патронаў. За патронамі быў паслан чырвонаармеец Насач. З выхадам з акопа Насача паранілі. З акопа быстра выскачыў Хапанцаў, падняў раненага таварыша і аднёс ва ўкрыццё. Баец быў выратаван. Хутка асколкамі разарваўшагася снарада Хапанцаў быў ранен.

Хапанцаў апрытомнеў у палявым шпіталі, стаў прыпамінаць, як усё адбылося. Потым раптам устаў і накіраваўся да ўрача.

— Таварыш урач, — заявіў ён, — я не магу тут аставацца, там, у акопах, у мяне аддзяленне на перадавых пазіцыях.

Яго смелая заява ні ў каго не выклікала здзіўлення. Тут да падобных фактаў прывыклі. Асведаміўшыся аб стане здароўя, урач дазволіў Хапанцаву пайсці на фронт.

З поспехам дасягнуў ён возера Хасан, абагнуў яго тупы мыс. Выразна былі відны акопы, у якіх знаходзіліся яго байцы.

Але вось, зусім побач, да слуху далятела выцце варожага снарада. Хапанцаў шчыльна прыціснуўся да зямлі... Больш ён нічога не памятаў.

Прышоў у прытомнасць зноў у тымжа палявым шпіталі. З-за высокай постаці ўрача выступіў артылерыст. Ён ціха апусціўся на зямляную падлогу і нежна губамі прысланіўся да гарачага ілба брата.

— Ну, вось, Нікітка, і сустрэліся, — слабым голасам прамовіў ранены Косця; яго твар азарыўся радаснай усмешкай.

Напярэдадні было заключана перамір'е.

П. ДЗІКІ.

«На защиту родины», № 21, ад 29/VIII 1938 г.

69 КОМСАМОЛЬЦАЎ-ПАГРАНІЧНІКАЎ ЗАНЕСЕНЫ НА ДОШКУ ГОНАРУ

Па прадстаўленню палітаддзела пагранічных і ўнутраных войск НКВД Беларускай акругі 69 комсамольцаў-пагранічнікаў, палкіх патрыётаў социялістычнай радзімы занесены на дошку гонару імя XX-годдзя ВЛКСМ, зацверджаную ЦК ЛКСМБ.

Кандыдатуры гэтых таварышаў былі аднадушна вылучаны комсамольскімі арганізацыямі часцей. Гэтыя маладыя пагранічнікі-комсамольцы — былыя рабочыя і калгаснікі. Яны пільна ахоўваюць заходнія рубяжы вялікага СССР. Кожны з іх — выдатнік баявой і палітычнай вучобы. У паслужным спіску кожнага занесенага на дошку гонару— па некалькі затрыманняў і схватак з дыверсантамі, тэрарыстамі, шпіёнамі замежных разведак. Пагранічныя войскі ведаюць імёны лепшых байцоў-комсамольцаў, іх храбрасць, знаходлівасць, смеласць у барацьбе з каварным ворагам.

Вось некалькі характарыстык таварышаў, якія ўдастоіліся чэсці быць занесенымі на дошку гонару імя XX-годдзя ВЛКСМ. Тав. Н. С. Оксамітны— выдатнік баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Ён праявіў выключную мужнасць і гераізм у ахове дзяржаўнай граніцы, знішчыўшы ва ўзброенай барацьбе групу фашысцкіх агентаў. Тав. В. А. Захараў — з часці, дзе камісарам тав. Логвінюк, — выдатнік, затрымаў трох парушальнікаў граніцы. Узнагароджан наркомам унутраных спраў БССР імянным гадзіннікам і грашовай прэміяй. Тав. Ахметшын Мубарокзян — выдатнік, мае 12 заахвочванняў. За праяўленую доблесць і геройства ў ахове дзяржаўнай граніцы ўзнагароджан наркомам унутраных спраў СССР імянным фотаапаратам і патэфонам і наркомам унутраных спраў БССР — імянным гадзіннікам і ганаровай граматай. Тав. А. П. Кажакоў— намеснік палітрука, комсорг заставы, выдатнік, праявіў выключную мужнасць і гераізм у ахове дзяржаўнай граніцы, знішчыўшы ва ўзброенай барацьбе групу фашысцкіх агентаў. Тав. І. П. Храбраў — комсорг заставы, выдатнік, затрымаў 6 парушальнікаў граніцы, мае рад заахвочванняў. Тав. В. С. Давідаў — аддзялённы камандзір. Вылучан на гэту пасаду з чырвонаармейцаў за добрыя і выдатныя паказальнікі ў службе, баявой і палітычнай падрыхтоўцы. Ён затрымаў двух парушальнікаў і мае 5 заахвочванняў.

Фатаграфіі лепшых комсамольцаў-пагранічнікаў будуць выстаўлены на акруговай фотавыстаўцы, якая арганізоўваецца ў гонар слаўнага юбілею комсамола.

ПРАВІЛЬНА АРГАНІЗАВАЦЬ ЗДАЧУ ІЛЬНАПРАДУКЦЫІ

ВІЦЕБСК. (Кар. «Звязды»). Сёлета калгасы вобласці вырасцілі і ўбралі добры ўраджай ільну. З вялікай любоўю гавораць аб ім у кожным калгасе, у кожнай хаце. Лён стаў асноўнай крыніцай калгаснага багацця, заможнасці. Зараз настаў апошні, рашаючы перыяд барацьбы за высокаякасны лён, пачалася апрацоўка трасты. У лік здачы дзяржаве паступаюць дзесяткі тон ільнавалакна, сотні тон ільнатрасты. Траста дэпутата Вярхоўнага Совета БССР звеннявой тав. П. К. Ціханскай (Аршанскі раён) ідзе выключна трэцім нумарам. Калгас імя ЦВК, Машкоўскага сельсовета (гэтага-ж раёна), здае трасту 2—2,5 нумарамі.

Аднак, у многіх калгасах вобласці існуе шкодная тэндэнцыя здаваць на ільназаводы неадсартаваную і недалежаўшую трасту, а высокаякасную скарыстоўваць для ручной і машыннай апрацоўкі на месцах. Тут у многім вінаваты работнікі раённых кантор Заготільну, якія жывое, аператыўнае кіраўніцтва ільнаапрацоўчымі работамі ў калгасах падмянілі дасылкай цыркуляраў. У выніку ў многіх калгасах не наладжан строгі догляд за ільном на сцелішчах, лён дрэнна сартыруецца.

На Копыскі ільназавод з усяго Аршанскага раёна сцякаюцца гружаныя ільнатрастой калгасныя грузавікі і фурманкі. Калгаснікі тт. Харын, Забалотнікаў, Науменка прывезлі з калгаса «Высокая зорка», Высоцкага сельсовета, тры вазы трасты. Траста не даляжалася на сцелішчах, зусім не адсартавана, на 30 процантаў засмечана травой. Старшыня калгаса тав. Болцікаў і адказная па ільну тав. Ю. Науменка безадказна аднесліся да сваёй справы, адгравіўшы на ільназавод трасту вельмі нізкай якасці.

Побач з фурманкамі калгаса «Высокая зорка» стаіць воз трасты, прывезены з калгаса імя Куйбышэва, Якаўлевіцкага сельсовета. Недаляжаўшая траста таксама не прайшла сартаванне. Старшыня калгаса тав. Сокалаў вылучыў возчыкам 12-гадовага хлапчука. Хлапчук доўга ўпрашвае прыёмшчыка ільназавода прыняць нізкаякасную ільнатрасту.

— У крайнім выпадку магу прыняць 0,5 нумарам,—згадзіўся, нарэшце, прыёмшчык.

— Вы прымайце хоць і нулявым. Мне абы здаць...

Між тым, калі-б гэтая-ж траста даляжалася на сцелішчы, прайшла сартаванне, яна магла-б пайсці 2 — 2,5 нумарамі. Гэты факт сведчыць аб тым, што некаторыя калгасы з-за безадказнасці кіраўнікоў недаатрымліваюць тысячы рублёў прыбытку.

Абураючы факт адбыўся на ільназаводзе 16 верасня, калі з калгаса «Большэвік», Машкоўскага сельсовета, прывезлі паўтары тоны недаляжаўшай трасты. Трасту не прынялі. Тады калгаснікі па ўказанню адказнай па ільну тав. Шыбека, разгрузілі вазы на полі ля ільназавода. Траста ляжыць там і да гэтай пары.

Згодна зводкі віцебскага абласнога зямельнага аддзела, Аршанскі раён па ільназдачы займае трэцяе месца ў вобласці. З 15 тысяч цэнтнераў ільнатрасты здадзена 4.044 цэнтнераў. У сапраўднасці-ж далёка не так. За агульнай лічбай хаваюцца калгасы і нават цэлыя сельсоветы, якія зусім яшчэ не прыступілі да ільназдачы (Баранскі, Крапівінскі і Туменскі).

Яшчэ горш абстаіць справа з апрацоўкай ільнавалакна ў калгасах. На 30 верасня па раёну замест патрэбных здаць згодна кантрактацыйных дагавораў 3.508 цэнтнераў здадзена толькі 119. У райземаддзеле (загадчык тав. Крупчанка) кожны дзень можна сустрэць старшынь калгасаў, брыгадзіраў, звеннявых, якія звяртаюцца за дапамогай ў рамонце і набыцці ільнаапрацоўчых машын. У калгасах зоны дзейнасці Аршанскай МТС амаль усе машыны сістэмы Антонава няспраўныя. Да машын нехапае пасаў, шасцёрак. На сядзібе МТС (дырэктар тав. Максіменка) стаяць неадрамантаванымі 2 мяльна-трапальныя машыны Сяргеева. Пяць ільнаапрацоўчых машын Антонава калгасаў Высоцкай МТС (дырэктар тав. Чэрняўскі) не падрыхтаваны да работы. Да іх нехапае запасных частак. Не адрамантаваны таксама мяльна-трапальныя машыны і ў Смальянскай МТС. Райза да гэтага часу не склаў дакладны план арганізацыі ільнаапрацоўкі ў калгасах.

Аналагічнае становішча ў Сенненскім раёне. У гэтым годзе калгасы раёна здаюць лён выключна ільнатрастой. На тэрыторыі раёна знаходзіцца тры ільназаводы. Але яны дрэнна падрыхтаваліся да прыёмкі ільнатрасты. На Пустынскім ільназаводзе яшчэ не закончан рамонт. Сенненскі і Машчонскі заводы працуюць з перабоямі. Да гэтага часу на заводах адсутнічаюць стандарты што, вядома, адбіваецца на правільным устанаўленні якасці трасты. Калгасы імя Кірава, Ульянаўскага сельсовета, «Індустрыя», Нямойцянскага сельсовета, імя Косарэва, Раснянскага сельсовета, прывозяць для здачы неадсартаваную трасту.

У гэтым годзе, як ніколі, узрасла актыўнасць калгаснікаў у барацьбе за сталінскі ўраджай ільну. Райкомам партыі, райвыканкомам, райземаддзелам, МТС і работнікам Заготільну неабходна арганізаваць яе, накіраваць па вернаму руслу, дапамагчы калгасам арганізавана правесці апрацоўку ільну і здачу высокаякаснай ільнапрадукцыі дзяржаве.

З. ЛАРЫСАЎ.

—o—

СТАХАНАЎЦЫ ЎБОРКІ БУЛЬБЫ

МАЗЫР. (Кар. «Звязды»). Калгаснікі і калгасніцы Палесся актыўна ўключаюцца ў перадкастрычніцкае спаборніцтва на хутчэйшае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ, на датэрміновае выкананне абавязацельстваў перад дзяржавай, на ўзорнае заканчэнне гаспадарчага года.

Маладыя патрыёты, рыхтуючы дастойную сустрэчу XX гадавіне Ленінска-Сталінскага комсамола, на ўборцы бульбы паказваюць узоры стаханаўскай работы. Калгасніцы-комсамолкі сельгасарцелі «Чырвоная звязда», Даманавіцкага раёна, — Фядора Шышкова, Ганна Русакова, Вера Цяслюк і многія іншыя на ўборцы бульбы выконваюць норму выпрацоўкі на 200 проц.

Першым у Даманавіцкім раёне закончыў уборку бульбы калгас «Чырвоны будаўнік». Калгас і калгаснікі поўнасцю выканалі абавязацельствы перад дзяржавай па бульбапастаўках. Калгаснікам выдана авансам бульбы па 3 кгр. на прападзень. Калгас «Герой працы», Нараўлянскага раёна, таксама закончыў уборку бульбы, поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па бульбапастаўках. Калгаснікам выдана авансам бульбы па 6 кгр. на прападзень.

С. БАЧУРА.

Выдатны лён вырашчан і ўбран у калгасе «Яўна дзіва», Лёзнянскага раёна. Ад ільнаводства калгас сёлета атрымлівае каля 60 тыс. рублёў. Лепшы ўраджай селекцыйнага ільну быў атрыман у звяне Насці Шалуцкінай. НА ЗДЫМКУ (справа налева): звенняя Насця Шалуцкіна і яе падругі Вера Шкецік і Валя Бондарава. Фото Я. Салавейчыка.

НЕ КІРУЮЦЬ СЦЯГВАННЕМ ХУТАРОЎ

У мэтах паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту, стварэння ўсіх умоў для росту заможнасці і культуры калгаснікаў партыя і ўрад правялі цэлы рад мерапрыемстваў па аказанню дапамогі калгаснікам Совецкай Беларусі, якія перасяляюцца з хутароў у калгасныя цэнтры. Гэта дапамога аказваецца ў выглядзе крэдытаў, водпуску лесу, будаўнічых матэрыялаў і т. д.

Калгаснае сялянства наглядна пераканалася ў важнасці хутчэйшай ліквідацыі хутарской сістэмы. Калгаснікі, якія жывуць на хутарах, гараць жаданнем хутчэй перасяліцца ў калгасныя цэнтры. Яркім доказам гэтага з'яўляецца масавы паток заяў ад калгаснікаў з просьбаю дапамагчы ім перасяліцца.

Але кіраўнікі Аршанскага раёна недаацэньваюць гэта законнае імкненне шырокіх мас калгаснікаў. Сцягванне хутароў — закінуты ўчастак работы ў раёне.

У раёне было 2357 хутарскіх гаспадарак. За 1937 год перавезена ў калгасныя цэнтры толькі 391 гаспадарка. Асталіся нескарыстанымі 192 тысячы рублёў грошай, адпушчаных урадам на сцягванне хутароў.

Зараз стала вядома, што да гэтай справы прыклалі свае брудныя рукі ворагі народа, якія арудвалі ў кіруючых органах раёна. Яны тармазілі работу па сцягванню хутароў, штучна ствараілі перашкоды.

Але-ж і зараз выкікі шкодніцтва ліквідуюцца выключна дрэнна. Дастаткова сказаць, што за прайшоўшы час 1938 года ў калгасныя цэнтры сцягнута толькі 165 гаспадарак. Гэта яшчэ раз гаворыць, што раённыя арганізацыі, некаторыя сельсоветы і калгасы недаацэньваюць велізарнай гаспадарча-палітычнай важнасці сцягвання хутароў.

Райвыканком (старшыня т. Кітаеў) па сутнасці не кіраваў работамі, звязанымі з перасяленнем калгаснікаў. Райвыканком не арыентуе старшынь сельсоветаў і калгасаў на скарыстанне мясцовых рэсурсаў.

На 1938 год быў зацверджан план сцягвання хутароў у колькасці 300 гаспадарак, у той час як калгаснікаў, якія жывуць на хутарах, у раёне ёсць больш 2000. План яўна заніжаны.

Дрэнна кіруюць сцягваннем хутароў некаторыя сельсоветы. Згодна плана калгасы Крапівенскага сельсовета (старшыня т. Барноў) павінны перавезці ў 1938 годзе 33 гаспадаркі, а перавезена толькі 9. Сельсавет не арганізаваў своечасовую вывазку лесаматэрыялаў. Калгасы імя Кірава і «Другая пяцігодка» да гэтага часу не вывезлі ўсяго лесаматэрыялу.

У раёне ёсць сельсоветы (Гальцеўскі, Шаткоўскі і інш.), якім райвыканком нават не даёў планаў сцягвання хутароў. Сцягванне хутароў у гэтых сельсоветах зусім спынена.

Наглядаюцца выпадкі няправільнага водпуску крэдытаў перасяляючымся. Напрыклад, у калгасе «Будаўнік», Малятнянскага сельсовета, аднаасобніка Шарая ўключылі ў спісак калгаса на атрыманне крэдыту і лесу, вызначанага для сцягвання хутароў. У гэты спісак быў уключан і рахункавод калгаса Пётр Стаховіч, які жыве ў іншым сельсавеце. І гэта ў той час, калі многія калгаснікі, якія жывуць на хутарах, чамусьці не папалі ў спісак для атрымання крэдытаў.

Праўленні некаторых калгасаў не арганізоўваюць работ, звязаных з перасяленнем. Справа дайшла да таго, што старшыня калгаса «Луч асвятлення», Кудаеўскага сельсовета, т. Рыпінскі прама заявіў: «Хутары сцягваць не буду, ёсць больш важная работа». І за ўвесь 1938 год у гэтым калгасе не сцягнут ні адзін хутар. А неабходна было сцягнуць 8 хутароў.

Пры выбары месца пад калгасную сядзібу часам ігнаруюцца такія важныя моманты, як забеспячэнне калгаснай жыхёлы выпасам, не ўлічваюцца патрабаванні паляводства і т. д.

Ал. КАЗЕЙ.

—o—

ВЯЛІКІЯ ДАХОДЫ АД КОКСАГІЗА

Каўчуканос коксагіз — новая і малавядомая культура. Аднак, калгасы Старадарожскага раёна ў асноўным асвоілі агратэхніку вырошчвання коксагіза і сёлета дабіліся высокіх ураджаяў.

Калгас «Шлях Ільіча» з плошчы ў 2,6 гектара пасеву коксагіза сабраў 200 кілограмаў насення. За насенне і карэнні каўчуканоса калгас атрымае 30.000 рублёў даходу. Калгас «Новы мір» атрымае 26.000 рублёў даходу. Вялікія даходы ад пасеву коксагіза будуць мець і іншыя калгасы раёна.

На жаль, вырошчванню коксагіза мала аддаюць увагі як райза, аблз, так і Наркамзем БССР. Наркамзем да гэтага часу не ўстанавіў нормы пасеваў коксагіза, не распрацаваны агратэхнічныя правілы.

Аграном Б. КРАСНЫ.

КІНО

„ВОРАГІ"

(Новы гукавы фільм вытворчасці «Ленфільм»).

Дадатным з'яўляецца той факт, што наша кінематаграфія ўсё часцей і часцей звяртаецца да геніяльных твораў вялікага пісьменніка Алексея Максімавіча Горкага. Ленінградская ордэна Леніна кінофабрыка выпусціла на экран новы гукавы мастацкі фільм «Ворагі» па аднайменнай п'есе М. Горкага.

П'еса М. Горкага адлюстроўвае годы пярэдадня рускай рэвалюцыі 1905 года, калі ад края да края Расійскай імперыі пракаціліся грозная хваля рэвалюцыйныя стачкі і забастоўкі рабочых. У п'есе паказаны два светы: свет вялікай праўды, сапраўднай чалавечай любві і нянавісці, прадстаўлены простымі рабочымі на чале з падпольным рэвалюцыянерам-канторшчыкам Сінцовым, і свет подлага бруду, крыві і бескультур'я, прадстаўлены фабрыкантамі Бардзіным і Скробатавым. У доме Бардзіных дажывае свае апошнія годы стары, тупы генерал рускай арміі Печанегаў, які апрача каманды «Шагам арш!» ад мінулага нічога не ўнаследваў. Тут-жа вечна п'яным чахне брат Скробатавых Якаў.

Тут мітусяцца, як угарэлыя, пляменніца Бардзіных Надзя і жонка Якава, актрыса Лугавая, якія, гледзячы на жыццё і справы рабочых, паўтараюць: «Гэтыя людзі перамогуць!»

На фабрыцы Бардзіна ў дыму і копаці, брудзе і павуцінні стогнуць ад цяжкай эксплуатацыі сотні рабочых. Скрозь усе прапоны і рагаткі да іх пранікае вогненае слова большэвіцкай праўды са старонак большэвіцкай газеты «Искра» і лістовак. З імі то ў кабаках, то ноччу на берагах ракі, то ў цёмных кутках фабрыкі вядзе гутаркі рэвалюцыянер Сінцоў. Рабочыя рашуча і настойліва патрабуюць павышэння зарплаты, паляпшэння свайго матэрыяльнага становішча, звальнення з завода паліцэйскага шпіка майстра Дзячкова.

Фабрыкант Бардзін па настойліваму ўгавору дырэктара завода Скробатава часова закрывае завод. З губернскага горада ён выклікае атрад царскіх войск. Беспрацоўем і штыхамі фабрыкант думаў упіхамірыць рабочых. Сінцоў заклікае рабочых да яднання, да рэвалюцыйнай барацьбы. На дварэ завода забраўся людскі натоўп. Рабочыя не згаджаюцца ні на якія ўступкі. Да іх вышаў дырэктар фабрыкі Міхаіл Скробатаў. У прыпадку звярынай нянавісці ён імкнецца пусціць кулю ў натоўп. Рабочы Акімаў выхватвае ў Скробатава рэвальвер і забівае яго.

Прыбываюць выкліканыя войскі. Пачаліся арышты рэвалюцыйных рабочых. Арыштаван Сінцоў, старык Леўшын, Грэкаў, Акімаў і іншыя. Яны спакойна глядзяць у твар смерці, бо ўпэўнены ў сваёй перамозе, у тым, што свет за вокнамі — гэта іх свет, што сапраўднымі гаспадарамі зямлі рускай і тварцамі новага будучага жыцця з'яўляюцца яны і мільёны ім падобных. Таму асабліва моцна і хвалююча гучаць словы ткача Леўшына:

— Мы загарэліся... Нас не пагасіш!

Багаты і глыбокі змест п'есы Горкага «Ворагі». Але патрэбна адзначыць, што кінофільм аказаўся куды бядней свайго сцэнічнага арыгінала. У ім не рэалізавана драматычная сіла п'есы Максіма Горкага, не раскрыты яе глыбокі філосафскі змест, аслаблена сіла меткага горкаўскага слова, якое заўсёды б'е ў цэль без промаху. Напружаны, гераічны дух барацьбы рускага пролетарыята, уся сіла горкаўскага выкрыцця ворагаў працоўнага народа амаль страцілася ў сухаватай кінематаграфічнай схеме.

Хаця ў фільме «Ворагі» знімаліся выдатныя совецкія акцёры: народны артыст Гардзін (Печанегаў), заслужаны артыст рэспублікі Паслаўскі (Якаў Бардзін), заслужаная артыстка рэспублікі Магарыл (Лугавая), Жэймо (Надзя), узё-ж у ім няма такіх вобразаў, якія ёсць у горкаўскай п'есе. Поўнакроўныя, сочныя, жыццёвыя вобразы п'есы работай спэнарыста і пастаноўшчыка — заслужанага дзеяча мастацтва Іваноўскага—абяскроўлены. Да гледача горкаўскія ідэі даходзяць не праз вобразы фільма, а праз свядомасць.

П. П.

ЗАБЫТЫЯ ПРАДМЕТЫ ВЫКЛАДАННЯ

Чарчэнне, якое па праву называецца міжнароднай тэхнічнай мовай, мае вялікае значэнне ў сярэдняй школе для політэхнічнага выхавання вучняў. Не меншае значэнне мае і маляванне, якое навучае вучняў асновам выяўленчай граматы, садзейнічае развіццю мастацкіх і творчых здольнасцей вучняў і навучае выкарыстоўваць атрыманыя навыкі і веды ў іншых школьных прадметах.

Пры паступленні ў тэхнічныя ВНУ прыходзіцца здаваць іспыты па гэтых дысцыплінах і на вучэнне іх адводзіцца многа часу. Але Наркамасветы БССР увесь час недаацэньвае выкладання гэтых дысцыплін у школе. У гэтым годзе адведзена толькі ½ гадзіны на маляванне ў V класе і ½ гадзіны ўзята на спевы. У тлумачэнні Наркамасветы сказана, што ні ў якім выпадку не дапускаецца замена аднаго прадмета другім.

У горадзе Мазыры школы выкладчыкамі спеваў не забяспечаны, бо ніхто не жадае браць нагрузку на поўгадзіны. У некаторых школах гэта гадзіна зусім прападае, а ў іншых выкарыстоўваецца на іншыя прадметы, толькі не на маляванне. Калі такое становішча ў абласным цэнтры, дзе ёсць музыкальная школа, можна сабе ўявіць, як забяспечана выкладанне спеваў у школах раёнаў.

Наркамасветы таксама правяў «чуткасць» у забеспячэнні настаўнікаў праграмамі па маляванню, якія складзены для школ РСФСР, дзе на маляванне адводзіцца 1 гадзіна ў пятым класе і 1 гадзіна ў шостым. Для школ дарослых НКА не ўлічыў усёй важнасці чарчэння і адвёў усяго ½ гадзіны на гэты неабходны прадмет, пачынаючы з VII класа.

Праграмы па чарчэнню таксама адсутнічаюць. Прылады па чарчэнню вельмі цяжка знайсці, асабліва сшыткі і танныя гатавальні. Вялікім мінусам у пастаноўцы графічнай граматы ў школе з'яўляецца інструкцыя аб перакодзе і выпуску вучняў. Па гэтай інструкцыі вучні, атрымаўшыя дрэнныя або вельмі дрэнныя адзнакі па чарчэнню, пераводзяцца ў наступны клас і выпускаюцца са школы. Гэтым недаацэньваецца чарчэнне і ў вачах вучняў.

Неабходна змяніць адносіны Наркамасветы да пастаноўкі графічнай граматы ў школе і даць адпаведныя ўказанні школам.

Л. ФРУМІН,
выкладчык чарчэння і малявання першай мазырскай сярэдняй школы.

ПАВЯЛІЧЫЦЬ ВЫРАБ ПРАДМЕТАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ

Клопаты аб задаволенні матэрыяльных і культурных патрэб насельніцтва ляжаць у прыродзе соцыялістычнай дзяржавы.

Партыя, яе сталінскі ЦК, асабіста тав. Сталін, совецкі ўрад няспынна клапоцяцца аб тым, каб рабочым, калгаснікам, нашай інтэлігенцыі жылося з кожным днём усё лепш і весялей. Апублікаванае ў «Правде» ад 15 ліпеня 1938 года рашэнне Совета Народных Камісараў СССР аб павелічэнні вырабу тавараў шырокага спажывання, прадметаў хатняга ўжытку і мэблі прасякнута выключнымі клопатамі партыі і совецкай улады аб задаволенні растучых патрэб прапоўных.

За годы другой сталінскай пяцігодкі бурна выраслі ў БССР галіны прамысловасці, якія вырабляюць прадметы шырокага спажывання. Так, у 1937 годзе пры агульным росце валавой прадукцыі ў адносінах да 1932 года ў 2 разы, трыкатажная прамысловасць вырасла ў 3,9 раза, харчовая — у 3 разы, абутковая — у 2 разы. Значна павялічыўся аб'ём вытворчасці прамысловай кааперацыі. Адных тавараў шырокага спажывання ў 1937 годзе і за 8 месяцаў 1938 года выпушчана на 596 мільёнаў 222 тысячы рублёў.

За годы двух сталінскіх пяцігодак прамысловая кааперацыя стварыла ў саматужнай прамысловасці вялікія асноўныя фонды. У сучасны момант яна яднае 961 вытворчае прадпрыемства, дробных і сярэдніх майстэрняў. У іх працуе 64.669 чалавек кааперараваных членаў арцелей.

Рад прадпрыемстваў і арцелей нядрэнна спраўляецца са сваімі задачамі. Гомельская ложкавая фабрыка (дырэктар тав. Іофе) пры плане выпуску ложкаў на 1938 год 27.000 штук за 8 месяцаў выпусціла 20.112 ложкаў. Стаханавец фабрыкі тав. Галаўнёў — заліўшчык ліцейнага цэха — выконвае норму на 159 проц., стаханавец тав. Гольдзін — зборшчык арматуры — на 293 проц., стаханавец тав. Пінчук — працуе на працэсе працяжкі труб — выконвае норму на 221 проц. і рад іншых.

Менскі скурпромсаюз пры гадавым плане ў 19.558 тыс. руб. за 8 месяцаў даў прадукцыі на 14.087 тыс. руб. — 72 проц. плана.

На прадпрыемствах і ў арцелях, вырабляючых прадметы шырокага спажывання, выраслі сотні і тысячы стаханаўцаў і ўдарнікаў, якія паказваюць высокія ўзоры прадукцыйнасці працы.

Аднак рад кіраўнікоў прамысловых наркаматаў і сістэмы саматужна-прамысловай кааперацыі нашай рэспублікі яўна недаацэньваюць справу вырабу тавараў шырокага спажывання. Праверка раду прадпрыемстваў і промарцеляў Беларусі паказала, што пастанова партыі і ўрада аб вытворчасці тавараў шырокага спажывання і расшырэнні асартыменту шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў выконваюцца яўна нездавальняюча.

Прадпрыемствы Наркамата мясцовай прамысловасці пры агульным сумарным выкананні плана выпуску прадметаў шырспажыву за першае паўгоддзе 1938 г. па многіх найбольш ходкіх тварах план сарвалі. Напрыклад, пасуды ацынкаванай недадана 143 тоны, вучнёўскіх сшыткаў — 8 мільёнаў, іголак ручных — 37 мільёнаў штук, іголак патэфонных — 42 мільёны штук і рад іншых тавараў шырспажыву. Цэлы рад прадпрыемстваў Наркаммясцпрома зусім не клапоцяцца аб якасці выпускаемай прадукцыі.

Завод імя Кірава (Віцебск) план вырабу дзіцячых веласіпедаў сарваў. За мест 150 шт. па плану ў другім квартале 1938 г. выпушчана 21 шт., прычым якасць веласіпедаў вельмі нізкая. На радзе заводаў Наркамата мясцовай прамысловасці (завод імя Варашылава, «Ударнік»—Менск, завод імя Кірава — Віцебск, барысаўскі завод «Металіст») ёсць магчымасць расшырыць асартымент прадметаў шырспажыву і выпрацоўваць сярэднія і малыя скавародкі, прасы духавыя, сярэднія і малыя замкі і рад іншых прадметаў. Аднак кіраўнікі прадпрыемстваў не ўзяліся пабольшэвіцку за расшырэнне асартыменту.

Прадпрыемствы Наркамата лёгкай прамысловасці недадалі ў першым паўгоддзі 12 тысяч пар дзіцячага хромавага абутку, 1.900 дзіцячых польтаў, 41.000 дзіцячых сарочак, 305 тысяч пар тэкстыльнага абутку, каля 5.000 дзіцячых панчох і т. д. Асабліва дрэнна працавала шклопрамысловасць—толькі за першае паўгоддзе 1938 г. яна недадала 637 тыс. шт лямпавага шкла, 380 тысяч лямп, каля 300 тысяч чайных стаканаў, прычым бой шкла, асабліва лямпавага з-за дрэннай упакоўкі даходзіць да 30 проц. і больш.

Неабходна таксама адзначыць, што якасць выпускаемай прадукцыі па асобных прадпрыемствах нізкая. Напрыклад, віцебская люстэркавая фабрыка выпускае люстры ў асноўным 3 сорту (71 проц.), другога сорту — 29 проц. пры поўнай адсутнасці першага сорту.

Асабліва дрэнна працуюць арцелі Белкалеспрамсаюза. Гэта сістэма мае велізарныя магчымасці для расшырэння вырабу тавараў шырспажыву. Аднак гэта не робіцца. Нават зацверджаны план як у суме, так і ў асартыменце, не выконваецца. Скарочана вытворчасць пэлага раду відаў мэблі і шчэпных тавараў. За 7 месяцаў 1938 г. план вырабу пісьмовых сталоў выкананы на 119 проц., а сталоў абедзеных —усяго на 52 проц., дываноў дарагіх—на 104 проц., кушэтак мяккіх — на 94 проц., а матрацаў — на 39,4 проц.

Гомельская арцель «Прагрэс» план вытворчасці кухонных сталоў за першае паўгоддзе выканала толькі на 65 проц., плацяных шафаў—на 20, а канцылярскіх сталоў—на 235 процантаў, канцылярскіх шафаў — 771 шт. Тут мае месца прамая антыдзяржаўная практыка з боку раду кіраўнікоў арцелей, якія гоняцца за высокімі прыбыткамі, пагарджаючы выпускам масавага асартыменту, патрэбнага спажыўцу.

Не лепш справа з выкананнем плана шырспажыву і ў сістэме Белкаапромсовета. Гэта сістэма недадала прадукцыі шырспажыву ў першым паўгоддзі 1938 г. на 24 мільёны рублёў, прычым у трэцім квартале справа не палепшылася, а пагоршылася.

Зусім нецярпімым з'яўляецца зрыў вытворчасці школьнага і дзіцячага асартыменту. Тут існуе прамы сабатаж з боку раду арцелей і промсаюзаў. За першае паўгоддзе 1938 года план вырабу школьнага абутку выканан на 49 проц. і дзіцячага — на 42 проц. За паўгоддзе недадана дзіцячага і школьнага абутку 150 тысяч пар. За лік дзіцячага абутку па тых-жа матывах выгаднасці вырабляюць мужчынскі і жаночы абутак.

Прывядзем некалькі фактаў.

Віцебская арцель «Кожобувнік» выпусціла за квартал мужчынскага абутку 102,4 проц., жаночага — 108 проц., а школьнага толькі 42 проц. і дзіцячага — 41 проц. Арцель «1-е мая» (Магілеў) выпусціла за квартал мужчынскага абутку 137 проц. плана, жаночага — на 71 проц., а школьнага — на 34 проц. Такое-ж становішча і ў радзе іншых арцелей.

Якасць выпускаемай прадукцыі ў многіх арцелях вельмі нізкая. У мэтах утойвання браку арцелі рэалізуюць бракаваны тавар праз свае ларкі. Напрыклад, гомельская арцель выбракаваныя Белпрамгандлем 700 пар абутку не пусціла ў пераробку, а накіравала для рэалізацыі ў свой ларок.

Асобныя райкомы, гаркомы КП(б)Б і горсоветы (Ветка, Орша, Рэчыца, Віцебск) не займаюцца як след пытаннем расшырэння вырабу тавараў шырокага спажывання. Палітмасавая работа, асабліва ў промарцелях, пастаўлена вельмі слаба.

Наша прамысловасць мае велізарныя рэзервы для хутчэйшага і рэзкага павелічэння вырабу тавараў шырокага спажывання. Неабходна да канца выкарчаваць вынікі шкодніцтва на прадпрыемствах, якія вырабляюць прадметы шырспажыву, а таксама ў саматужна-прамысловых арцелях. Навесці большэвіцкі парадак на заводах і ў сістэме промкааперацыі (Наркаммясцпром, Белкалеспромсаюз, Белпромсовет). Трэба павесці рашучую барацьбу з тэндэнцыяй вырабляць толькі дарагія прадметы, а не тое, што патрабуе спажывец.

Задача кожнага партыйнага кіраўніка, гаспадарніка, профсаюзных работнікаў, наркаматаў, трэстаў і промкааперацыі — забяспечыць пакрыццё прарыву першага паўгоддзя, трэцяга квартала і пашырыць асартымент выпуску прадметаў шырспажыву ў чацвертым квартале і ў 1939 г., скарыстаўшы для гэтага ўсе ўнутраныя рэзервы. Наркамат мясцовай прамысловасці павінен звярнуць асаблівую ўвагу на арганізацыю вырабу новых відаў тавараў шырспажыву, стварэнне спецыяльных цэхаў на такіх заводах, як «Чырвоны металіст» у Барысаве, «Чырвоны барацьбіт» у Оршы, завод ланцугоў Галя ў Менску, а таксама арганізаваць выраб настольных лямп, пепельніц, разетак, ролікаў і інш прадметаў з перафіліта. Неабходна таксама арганізаваць выпуск прымусных гарэлак з чыгуну, газовак і т. д. Белкалеспромсаюз абавязан ліквідаваць прарыў і ў чацвертым квартале далаткова расшырыць асартымент, асабліва па прадметах хатняга ўжытку (буфеты і поўбуфеты, камоды, сталы абедзеныя, кухонныя, матрацы, дзіцячыя ложкі, кушэткі, дываны і інш.).

Белкаапромсовету неабходна звярнуць асаблівую ўвагу на расшырэнне выпуску школьнага і дзіцячага абутку, дзіцячых калясак, ваначак, дзіцячых валенак, панчох і наскоў, музыкальных цацак, баянаў, гармонікаў і інш. Рашэнне ўрада аб расшырэнні сеткі рамонтных майстэрань швейных, скураных і інш павінна быць выканана ў самы бліжэйшы час.

Наркамат лёгкай прамысловасці павінен ажыццявіць расшырэнне гомельскай панчошна-трыкатажнай фабрыкі. Ад кіраўнікоў шкляной прамысловасці неабходна патрабаваць, каб яны ў чацвертым квартале пакрылі прарыў першага паўгоддзя і трэцяга квартала.

Наркамат павінен дабіцца ў чацвертым квартале 1938 г. значнага расшырэння асартыменту баваўняных, шарсцяных, валяльна-войлачных, пенькаджутавых, скурабутковых, галантарэйных і раду іншых прадметаў шырокага спажывання.

Справа гонару ўсіх рабочых і работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў прадпрыемстваў уключыцца ў перадкастрычніцкае сацыялістычнае спаборніцтва, даць совецкаму спажыўцу як можна больш прадметаў шырокага спажывання высокай якасці, разгарнуць соцспаборніцтва на перавыкананне планаў і расшырэнне вырабу тавараў шырспажыву, дабіцца ўдзеўшалення выпускаемай прадукцыі, ліквідаваць брак, скарыстаць ўсе ўнутраныя рэзервы.

А. ГЛОЗМАН,
Інструктар Промтранспартнага аддзела ЦК КП(б)Б.

СПРЭЧКІ АБ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫЦЫ ФРАНЦЫІ

НА ПАСЯДЖЭННІ ФРАНЦУЗСКАЙ ПАЛАТЫ ДЭПУТАТАЎ

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння днём адкрылася пасяджэнне палаты дэпутатаў Глава ўрада Далад'е выступіў з дэкларацыяй аб апошніх знешне-палітычных падзеях і аб палітыцы французскага ўрада.

***

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). У сувязі з адкрыццём парламента Жак Дзюкло піша ў «Юманітэ»:

«Асмельваюцца гаварыць, што ў Мюнхене «выратавалі мір» У Мюнхене проста падпісаліся пад патрабаваннямі Гітлера Дастаткова было не ўступіць, каб прымусіць Мусаліні і Гітлера да адступлення, і тым самым захаваць мір.

З другога боку, многія задаюць сабе цяпер пытанне, ці не прысутнічалі мы ў апошні час пры камедыі, за якую зараз павінны расплачвацца французскія плацельшчыкі палаткаў? Ці не былі мабілізацыя, скарачэнне вулічнага асвятлення ў некаторых кварталах Парыжа, размеркаванне пяску для процівапаветранай абароны і т. д арганізаваны з тым, каб запалохаць насельніцтва і дазволіць Гітлеру — Мусаліні—Чэмберлену—Далад'е выступіць у ролі «выратавальнікаў міру?»

***

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Пасля агалашэння дэкларацыі ўрада і выступленняў старшыні парламенцкай камісіі па ваенных справах Мьеле і дэпутата Шышры, Далад'е паставіў пытанне аб давер'і ўраду.

У спрэчках па матывах галасавання комуністычны дэпутат Габрыэль Перы заявіў, што комуністы будуць галасаваць супроць рэзалюцыі давер'я ўраду. Указаўшы на тое, што Чэхаславакія прынесена ў афяру Гітлеру, Перы пратэставаў супроць мюнхенскага пагалнення, адкрываючага германскаму фашызму дарогу на Балканы.

Затым выступіў рад іншых прамоўцаў, у тым ліку Марэн, Фросар, Анры дэ Керыліс, Блюм і інш. Анры дэ Керыліс рэзка крытыкаваў мюнхенскае пагадненне, указаўшы, што яно «дасталося Францыі вельмі дарагой цаной» Лідэр соцыялістаў Блюм заявіў у сваім выступленні, што соцыялісты будуць галасаваць за давер'е ўраду.

У рэзультаце галасавання за давер'е ўраду было падана 535 галасоў і супроць — 75 галасоў.

ПРАМОВА ЧЭМБЕРЛЕНА Ў ПАЛАЦЕ АБШЧЫН

ЛОНДАН, 4 кастрычніка (БЕЛТА). Выступіўшы ў палаце абшчын прэм'ер Чэмберлен прабаваў апраўдаць сваю палітыку зговару з фашысцкімі агрэсарамі У прыватнасці, ён прабаваў даказаць, што паміж мемарандумам Гітлера і мюнхенскім рашэннем ёсць істотная розніца. Ён усяляк усхваляў рашэнні мюнхенскай нарады і яе ўдзельнікаў, асабліва Мусаліні. Усё-ж Чэмберлен павінен быў прызнаць, што мюнхенскае рашэнне зусім яшчэ не азначае забеспячэння працяглага міру. У гэтай сувязі ён падкрэсліў, што ўрад не павінен аслабляць тэмпы ўзбраенняў.

Калі Чэмберлен пад націскам крытыкі ў палаце абшчын і грамадскага настрою ў Англіі вымушан быў заявіць, што чэхаславацкі народ, які перажывае зараз нацыянальнае гора, праявіў добрае самаўладанне, дастойнства і дысцыпліну, з лавы лейбарыстаў раздаліся гучныя крыкі—«Ганьба!»

Далей Чэмберлен паведаміў што чэхаславацкі ўрад звярнуўся з просьбай прадаставіць яму пазыку ў 30 млн. фунтаў стэрлінгаў пад гарантыю англійскага ўрада Чэмберлен указаў што англійскі ўрад згадзіўся прадаставіць Чэхаславакіі пазыку ў 10 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў.

СТАНОВІШЧА Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ

Германскія войскі занялі тэрыторыю, не належачую акупацыі

ЛОНДАН, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Брытыш юнайтэд прэс, германскія войскі занялі сяленне Крумау (Паўднёвая Багемія), якое знаходзіцца за межамі першай зоны, г. зн на тэрыторыі, не належачай германскай акупацыі. Германскія салдаты спвярджаюць, нібы чэхаславацкія войскі абстралялі гэта сяленне з процітанкавых гармат.

Міжнародная камісія санкцыянавала гэтыя дзеянні германскіх войск.

Напад генлейнаўцаў на рабочыя кварталы

ПРАГА, 4 кастрычніка. (БЕЛТА) 2 кастрычніка вечарам каля 20 генлейнаўцаў зрабілі атаку на рабочы квартал Жацлержэ (на поўнач ад Трутнова). Генлейнаўцы адкрылі жорсткі агонь з кулямётаў, вінтовак і рэвальвераў, аднак рашучымі дзеяннямі чэхаславацкія войскі прымусілі іх адступіць. Перастрэлка прадаўжалася каля 3-х гадзін.

***

ПРАГА, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ноччу ў горадзе Шпічак (Паўднёва-Заходняя Чэхія) мясцовыя генлейнаўцы зрабілі ўзброены напад на жандарскі пост, абязброілі шэсць жандараў, перарэзалі тэлефонныя і тэлеграфныя правады і зруйнавалі рад складаў ваеннага міністэрства Генлейнаўцы ставілі перад сабой задачу перашкаджаць эвакуацыі ўнутр Чэхаславакіі ваенных складаў і запасаў (раён у бліжэйшыя дні пераходзіць да Германіі). Прыбыўшым на месца атрадам жандармерыі парадак у раёне быў адноўлен.

У горадзе Гроб (Паўночна-Заходняя Чэхія) арыштаваны чэхаславацкай жандармерыяй генлейнавец цяжка раніў выстралам з рэвальвера аднаго жандара. Пры спробе ўцячы генлейнавец быў забіт

Ультыматыўнае патрабаванне славацкіх аўтанамістаў

ПРАГА, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Сёння раніцой клерыкальная партыя славацкіх аўтанамістаў (партыя Глінкі) прад'явіла ўраду ультыматыўнае патрабаванне неадкладнага агалашэння аўтаноміі Славакіі Прадстаўнікі партыі славацкіх аўтанамістаў пагражаюць, што ў выпадку незадаволення ультыматума яны будуць дабівацца далучэння Славакіі да Польшчы Славацкія сепаратысты далі ўраду 24-гадзінны тэрмін.

Перагаворы вяліся сёння ўвесь дзень Перадаюць, што к вечару славацкія аўтанамісты згадзіліся на стварэнне славацкага парламента, мясцовага ўрада і на ўключэнне ў састаў агульначэхаславацкага ўрада аднаго міністра - славака, маючага права «вето» (забароны па ўсіх пытаннях, «закранаючых інтарэсы Славакіі»).



ДА ВАЕННЫХ ДЗЕЯННЯЎ У КІТАІ.
Атрад байцоў кітайскай арміі накіроўваецца на перадавыя пазіцыі (Цэнтральны фронт).
Саюзфото.

НОВЫ САСТАЎ ЧЭХАСЛАВАЦКАГА ЎРАДА

ПРАГА, 5 кастрычніка. (БЕЛТА) Утворан новы кабінет міністраў Чэхаславакіі ў наступным саставе: прэм'ер і ваенны міністр генерал Сыровы; міністр шляхоў зносін, пошты і тэлеграфа генерал Гайдаш (славак); міністр унутраных спраў Чэрны (былы аграрый); міністр замежных спраў Хвалкоўскі (пасланнік у Рыме, аграрый); міністр грамадскіх работ генерал Гусарэк (беспартыйны); міністр земляробства Файерабенд (аграрый кіраўнік сельскагаспадарчай каапэрацыі); міністр фінансаў Кальфус (беспартыйны); міністр юстыцыі Файнор (беспартыйны, славак); міністр асветы Букоўскі (нацыянал-дэмакрат, славак); міністр гандлю Карваш (славак, блізкі да партыі славацкіх аўтанамістаў); міністр соцыяльнага забеспячэння і аховы здароўя Зенкл (чэшскі соцыяліст, гарадскі галава Прагі); міністр па справах Славакіі Сокал (сакратар партыі славацкіх аўтанамістаў)

Міністэрства па справах Славакіі ўпоў створана ў рэзультаце кампрамісна пагаднення з партыяй славацкіх аўтанамістаў.

ПАСЛЯ МЮНХЕНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

ПАРЫЖ, 4 кастрычніка. (БЕЛТА). Па вестках газеты «Эвр», германскім міністэрствам прапаганды аддан загад разгарнуць шалёную кампанію ў карысць уключэння ў састаў Германіі «ўсіх тэрыторый Еўропы, населеных немцамі» Вялікім тыражом выдана ў Германіі гак называемая «лінгвістычная карта Еўропы» У каментарыі да гэтай карты заяўляецца, што з 88 мільёнаў немцаў Еўропы толькі 75 мільёнаў жывуць у Германіі, тады як астатнія 13 мільёнаў прадаўжаюць аставацца ў іншых краінах.

На карце ў якасці краін з нямецкім насельніцтвам паказаны: Эльзас-Латарынгія Эйпен, Мальмедзі, Шлезвіг, значныя часткі Польшчы Літвы, Чэхаславакіі, Венгрыі, Югаславіі, Італіі і Швейцарыі.

НОВЫ АНГЛІЙСКІ ДЭМАРШ У ПРАЗЕ

ПРАГА, 5 кастрычніка (БЕЛТА) Як паведамляюць з паінфармаваных крыніц, учора англійскі пасланнік у Празе Ньютон заявіў міністру замежных спраў пратэст супроць «недружалюбнага» тона чэхаславацкага друку ў адносінах да Англіі і катэгарычна патрабаваў спынення ў друку крытыкі палітыкі Англіі.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

УСХОДНІ ФРОНТ

Паводле паведамлення іспанскага міністэрства абароны ад 4 кастрычніка, у зоне Эбро рэспубліканскія войскі ў рэзультаце паспяховых контратак занялі вышыні 332 і 321 у раёне Сіера Лаваль дэ ла Тора Інтэрвенты, шырока прымяняючы артылерыю, авіяцыю і танкі, прадаўжалі атакі на паўднёвы ўсход ад Коль дэль Косо Ім першапачаткова ўдалося захапіць тут вышыню 282 Аднак рэспубліканцы праз некаторы час адкінулі фашыстаў і зноў занялі гэту вышыню Бой у гэтым раёне прадаўжаецца.

Рэспубліканскія бамбардыроўшчыкі зрабілі налёт на фашысцкі аэрадром у Ла Сеніа (на паўднёвы захад ад Тартосы) знішчыўшы на ім вялікую колькасць замежных фашысцкіх самалётаў і склады гаручага.

У час паветранага бою супроць 12 двухматорных фашысцкіх самалётаў і вялікага ліку германскіх знішчальнікаў рэспубліканскія лётчыкі збілі 1 двухматорны самалёт і 1 знішчальнік інтэрвентаў і вярнуліся на свае базы без страт.

***

У ноч на 4 кастрычніка фашысцкая авіяцыя бамбардыравала горад Дэніа (на поўдзень ад Валенсіі), а таксама порт Валенсіі, дзе адна бомба папала ў англійскі гандлёвы параход «Люімніч», зрабіўшы на ім разбурэнні і раніўшы двух матросаў Раніцай 4 кастрычніка 15 італьянскіх трохматорных самалётаў бамбардыравалі з вялікай вышыні раён барселонскага порта. Былі пашкоджаны англійскія гандлёвыя судны «Торнбей» і «Гоцік» Есць афяры сярод насельніцтва

З АПОШНЯЙ ПОШТЫ

ШКОДНАЯ ПАСПЕШНАСЦЬ

4 кастрычніка г. г. газета «Чырвоная змена» надрукавала 3 заметкі пад загалоўкам «Вывучаюць гісторыю ВКП(б)». У адной з іх паведамляецца, што

«комуністы, комсамольцы і несаюзная моладзь Аршанскага настаўніцкага інстытута і педвучылішча прыступілі да вывучэння Кароткага курса гісторыі ВКП(б)».

Далей, у гэтай-жа заметцы, мы чытаем, што

«з ліку студэнтаў вылучаны прапагандысты, з якімі праводзіцца семінар».

Аказваецца, што яшчэ прапагандысты не падрыхтаваны да вывучэння Гісторыі ВКП(б). Паўстае пытанне: для чаго-ж спатрэбілася рэдактару газеты тав. Матузаву арыентаваць партыйныя і комсамольскія арганізацыі на паспешнае, без належнай падрыхтоўкі вывучэнне Гісторыі партыі?

У другой заметцы рэдакцыя газеты ў цялячым захапленні піша:

«усе 108 комсамольцаў Крычаўскага цэментнага завода ахоплены палітвучобай. У 4-х палітшколах ідзе СУР'ЁЗНАЕ вывучэнне Кароткага курса гісторыі ВКП(б). У гуртках ужо РАЗАБРАНЫ І ПРАЧЫТАНЫ першы і другі раздзелы новага падручніка».

Што і гаварыць, «аператыўнасць»—нечуваная! Але дзе-ж тут сур'ёзнае вывучэнне? Каму патрэбна такое забяганне наперад? Паказваючы справу такім чынам — нібы чытка і разбор гэта і ёсць сур'ёзнае вывучэнне Гісторыі ВКП(б), газета наносіць прамую шкоду інтарэсам большэвіцкай прапаганды.

Трэба, нарэшце, зразумець, што вывучэнне Гісторыі ВКП(б) — справа сур'ёзная, якая не церпіць спешкі і шуміхі, а патрабуе паслядоўнасці і высокай арганізаванасці.

У САЮЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

5 кастрычніка адбылося пашыранае пасяджэнне праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР, у рабоце якога прынялі ўдзел пісьменнікі і крытыкі Менска. Цэнтральным пытаннем парадку дня было абмеркаванне новай паэмы маладога паэта А. Куляшова «У зялёнай дубраве». Даклад аб новай паэме зрабіў тав Ларчанка.

«У зялёнай дубраве» — твор, у якім лёгкім, простым, блізкім па сваёй форме да народнага, вершам расказваецца аб шчаслівым жыцці калгаснікаў, аб новых узаемаадносінах людзей соцыялістычнай вёскі, аб шчасці калектыўнай працы.

У абмеркаванні паэмы прынялі ўдзел тт. Броўка, Бядуля, Глебка, Клімковіч і іншыя паэты і пісьменнікі Новая паэма сустрэла агульнае адабрэнне выступаючых.

Праўленне прыняло рашэнне вынесці новы твор Куляшова на шырокае абмеркаванне грамадскасці Менска шляхам арганізацыі літаратурных вечароў.

Праўленне разглядзела таксама пытанне аб удзеле пісьменнікаў БССР на нарадзе маладых пісьменнікаў Беларускай асобай ваеннай акругі, якая ў хуткім часе будзе праведзена Палітупраўленнем БАВА. Для ўдзелу ў нарадзе вылучана брыгада ў саставе тт. Лынькова, Чорнага, Клімковіча, Кучара, Броўкі, Бядулі і Шапіра.

На праўленні вырашана пытанне аб устанаўленні ў Саюзе пісьменнікаў штодзённага дзяжурства членаў праўлення, у абавязак якіх уменяецца вырашэнне штодзённых пытанняў работы беларускай пісьменніцкай арганізацыі.

МЫТАРСТВЫ ПАСАЖЫРАЎ

Мястэчка Плешчаніцы (Менская вобласць) знаходзіцца далёка ад гарадскіх пунктаў Працоўным раёна вельмі часта патрэбна ехаць па розных справах у горад Менск. Але тут да гэтага часу не паклапаціліся аб тым, каб наладзіць нармальны аўтобусна-пасажырскі рух.

Грамадзянам, якім патрэбна ехаць у Менск прыходзіцца прасіць ласкі ў шофераў, якія праязджаюць па шляху.

Працоўныя Плешчаніц не раз узнімалі пытанне перад сваім раённым кіраўніцтвам аб наладжванні аўтобусна-пасажырскага руху. Але ўсе патрабаванні асталіся пустым гукам.

Е. І. ЛОГІН.

—О—

КАЛІ Я АТРЫМАЮ ПРОФСАЮЗНЫ БІЛЕТ?

У студзені 1938 года я падаў заяву ў лельчыцкі РК саюза медсанпрацы аб прыёме мяне ў члены саюза, дзе я быў прынят. Пасля ўвесь матэрыял быў накіраван у ЦК саюза медсанпрацы БССР для атрымання профбілета Аднак, прайшло ўжо 8 месяцаў, а профбілета я не атрымаў

Я ўжо некалькі разоў звяртаўся ў лельчыцкі райком саюза, але старшыня Левін па-бюракратычнаму заўсёды адказвае: «Хутка атрымаеш».

Таксама некалькі разоў звяртаўся ў ЦК саюза медсанпрацы, які некалькі раз нават прапаноўваў Левіну спыніць валакіту з білетам, але і гэта прапанова асталася нядзейснаю.

Калі-ж я атрымаю профбілет?

Ю. Я. ФУРМАН.

ПА ГАРАДАХ І РАЁНАХ РЭСПУБЛІКІ

★ На пляцу каля хойніцкага раённага дома соцыялістычнай культуры пачаты работы па ўстаноўцы помніка Владзіміру Ільічу Леніну. Адкрыццё помніка прыўрочваецца к дню XXI гадавіны Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі («Ленінскі сцяг»).

★ Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «Вясёлы бераг», Крапівенскага сельсовета, Аршанскага раёна, звярнуліся з хадайніцтвам у прэзідыум райвыканкома аб прысваенні іх калгасу імя загінуўшага героя Совецкага Саюза тав. Леванеўскага. Прэзідыум райвыканкома задаволіў хадайніцтва калгаснікаў. Калгасу надана імя Леванеўскага. («Ленінскі прызыў»).

★ Добра працуе драматычны гурток пры калгасе «Трэці з'езд Совецкаў», Казуліцкага сельсовета, Кіраўскага раёна. Гуртком, у якім прымае ўдзел 16 калгаснікаў-комсамольцаў, кіруе настаўнік тав. Б. Падаляк. Драматычным гуртком пастаўлена ўжо 10 п'ес — «Сватанне» — Чэхава, «Паўлінка»—Янкі Купалы і інш. («Кіравец»).

—О—

АСВАЕННЕ РАКІ ПРОНІ

ПРАПОЙСК. (Па тэлеграфу). Адбыўся сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, прысвечаны сканчэнню работ па транспартнаму асваенню ракі Проні За тры месяцы асвоена 40 кілометраў пущі Выцягнута з вады 500 кубаметраў чорнага дубу і 850 кубаметраў дравяных таплякоў, пабудаваны 4 баржы і 8 лодак.

Вык. абавязкі адказнага рэдактара Д. Т ЛЕБЕДЗЕЎ

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА
17 КАСТРЫЧНІКА 1938 г.
адкрыццё сезона
У памяшканні Бел Дзярж аўрэйскага тэатра
Рэпертуар
НОВЫЯ ПАСТАНОЎКІ
Рымскі-Корсакаў
ЦАРСКАЯ НЯВЕСТА
Чайкоўскі
ЛЕБЯДЗІНАЕ ВОЗЕРА
Даргамыжскі
РУСАЛКА
Пучыні
ЧЫО-ЧЫО-САН
Узноўленыя пастаноўкі
Дзержынскі
ЦІХІ ДОН
Пучыні
ТОСКА
Верді
РЫГАЛЕТО
Герталь
МАРНАЯ ПЕРАСЦЯРОГА (Тщетная предосторожность)
ПРЫМАЮЦЦА ЗАЯЎКІ Ў касе тэатра на пастаянныя месцы і калектыўныя паходы з 12 да 2 г і з 5 да 8 г веч.

Гастролі Віцебскага Беларджтэатра (памяшк Белардждрамтэатра)
6 кастрычніка
ВАЙНА
Пачатак у 8 г. веч.
Каса з 12 да 2 і з 5 да 8 г. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка»
ВОРАГІ

Кінотэатр «Інтэрнацыянал»
АГНІ ВЯЛІКАГА ГОРАДА

Кінотэатр «Спартак»
Людзі даліны Сумбар

Дзіцячы кінотэатр
1. Выпадак на граніцы
2. Ля паўдняёвых граніц
3. Піонерыя № 7.
4. Насарог.

Кінотэатр «Навіны дня»
Выпадак на граніцы

Кінотэатр «Парыжская Комуна» (ПІКА)
ПРАФЕСАР МАМЛОК

БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ
АБВЯШЧАЕ,
што 15 кастрычніка г. г. ў 6 гадзін вечара, у 214 аўдыторыі (біялагічны корпус)
АДБУДЗЕЦЦА
ПУБЛІЧНАЯ АБАРОНА ДЫСЕРТАЦЫІ
НА СТУПЕНЬ КАНДЫДАТА БІЯЛАГІЧНЫХ НАВУК
аспіранта КІЧЫНАЙ Б. М.
НА ТЭМУ: «ДА МАРФАЛОГІІ СТРАЎНІКА ШТУШАК»
Афіцыяльныя апаненты: прафесар-доктар МАКУШАК М. Е. і дацэнт ЗУБКОВІЧ Е. М.
ДЫРЭКЦЫЯ БДУ.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР
(XVIII ГОД ІСНАВАННЯ).
20 КАСТРЫЧНІКА
АДКРЫЦЦЁ ЗІМОВАГА СЕЗОНА
1938-39 года.

МЕНГАЛОЎУНІВЕРМАГУ
(Совецкая 43).
патрэбны
РАБОЧЫЯ ДЛЯ СКЛАДА І ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ
ЗВЯРТАЦЦА Ў АДДЗЕЛ КАДРАЎ (6 ПАВЕРХ).

Выдавецтву «Звязда»
патрэбны
КАЧАГАРЫ І ІСТАПНІКІ.
Зварачацца: Совецкая. 49. другі паверх, пакой № 1.

ГОМЕЛЬСКІЯ МАЙСТЭРНІ Наркамасветы
МАЮЦЬ У ПРОДАЖЫ
МЭБЛЮ
для дзіцячых садоў
З запытаннямі звяртацца па адрасу: Г. ГОМЕЛЬ, КААПЕРАЦЫЙНАЯ, 64.

ДА ЎВАГІ АКРУГОВЫХ, ГАРАДСКІХ І РАЁННЫХ АДДЗЕЛАЎ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ, ЛЯЧЭБНЫХ НАВУКОВЫХ УСТАНОЎ ІНСТЫТУТАЎ ЛАБАРАТОРЫЯЎ І ІНШ.
Рэспубліканская база МЕДІНСТРУМЕНТАЎ
ГАЛОЎНАГА АПТЭЧНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСІ
ПРЫСТУПІЛА ДА СКЛАДАННЯ
ЗАЯВАК на 1939 год
на мед інструменты і медабсталяванне
ПРОСІМ ЛЕЧУСТАНОВЫ ІНСТЫТУТЫ, ЛАБАРАТОРЫІ І ІНШ ПРАДСТАВІЦЬ СВАЕ ЗАЯЎКІ НЕ ПАЗНЕЙ 15 КАСТРЫЧНІКА Ў РЭСПУБЛІКАНСКУЮ БАЗУ МЕДІНСТРУМЕНТАЎ ГАЛОЎНАГА АПТЭЧНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСІ. (Менск, Совецкая, 67, тэл. 22-121).

ВНИМАНИЮ ЛЕЧУЧРЕЖДЕНИЙ и ВРАЧЕЙ
Управление Химико-фармацевтической промышленности Наркомздрава СССР—Москва, Кривоколенный пер., 12, производит и отпускает аптекоуправлениям в неограниченных количествах следующие медикаменты:
1. Атофан таблет. и пор.
2. Адалин
3. Авертин (Наркоман).
4. Ампулы Лобелин.
5. Веронал
6. Валидол.
7. Героин солянокислый.
8. Гиталин.
9. Дионин.
10. Дикаин
11. Железо глицеринофосфорнокислое.
12. Иодоформ.
13. Камфора однобромистая.
14. Эфедрин, табл. и пор.
15. Кодеин чистый
16. Кодеин фосфорнокислый.
17. Конвалин в ампулах
18. Колларгол.
19. Калий иодистый
20. Натр. иодистый
21. Калий марганцевокислый.
22. Люминал табл. и пор.
23. Мединал
24. Морфий солянокислый.
25. Миарсенол.
26. Новокаин.
27. Пантопон.
28. Папаверин.
29. Салипирин
30. Терпин-гидрат.
31. Молочный сахар.
32. Ментол.
Требуйте во всех аптеках

10 кастрычніка 1938 г.
ДРУГІ ТЫРАЖ ВЫІГРЫШАЎ ПАЗЫКІ 1938 г.
Дзяржаўная ўнутраная выігрышная пазыка 1938 г. выпушчана ў аблігацыях коштам у 200, 100 і 50 руб.
УВЕСЬ ДАХОД ПА ПАЗЫЦЫ ВЫПЛАЧВАЕЦЦА Ў ВЫГЛЯДЗЕ ВЫІГРЫШАЎ.
На працягу дваццацігадовага тэрміна пазыкі будзе праведзена 120 тыражоў выігрышаў, па 6 тыражоў у год.
У КОЖНЫМ ТЫРАЖЫ БУДЗЕ РАЗЫГРЫВАЦЦА
4 выігрышы па 25.000 руб.
20 » па 10.000 »
120 » па 5.000 »
1200 » па 1.000 »
4336 » па 400 »,
а ўсяго 5.680 выігрышаў на суму 3.834.400 рублёў.
ЧАРГОВЫЯ ТЫРАЖЫ У 1938 ГОДЗЕ — 10 КАСТРЫЧНІКА І 10 СНЕЖНЯ Г. Г.

АБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ СВАБОДНА ПРАДАЮЦЦА ЗА НАЯЎНЫ РАЗЛІК І КУПЛЯЮЦЦА АШЧАДНЫМІ КАСАМІ.
Адначасова праводзіцца канверсія дзяржаўных унутраных выігрышных пазык 1929 г., 1930 г., 1932 г. і 1935 г.
Абмен аблігацый гэтых пазык у сувязі з канверсіяй, на аблігацыі дзяржаўнай унутранай выігрышнай пазыкі 1938 г. праводзіцца ашчадкасамі па намінальнаму кошту да 1 красавіка 1939 г.
НАБЫВАЙЦЕ АБЛІГАЦЫІ ДЗЯРЖАЎНАЙ УНУТРАНАЙ ВЫІГРЫШНАЙ ПАЗЫКІ 1938 г.!

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск Совецкая, 49. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ рэдактара - 21-352; намесніка рэдактара — 25-188; сакратарыята — 20 830; АДДЗЕЛАЎ: партыйнага — 21-353; совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412; прамысловага — 21-356; сельскагаспадарчага — 21-846; літаратуры, мастацтва навукі і асветы—23-955; мясцовай і замежнай інфармацыі — 25 189; аддзел пісем — 20 844, 21-399, 21-885; ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры — 21-556; заг. выдавецтва — 21-358; аб'яў — 25-384

Уп. Галоўлітбела № Б—5710. Менск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. К., М., Б.